Всесоюзная библиотека имени В. И. Ленина
Библиотека имени В. И. Ленина
МОСКВА 19 УЛ. МАРКСА ЭНГЕЛЬСА 14 ВСЕСОЮЗНОЙ БИБЛИОТЕКЕ ИМ. ЛЕНИНА 1.12

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 42 (5716) | 20 лютага 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

ПАСТАНОВА НАДЗВЫЧАЙНАГА XII З'ЕЗДА СОВЕТАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

АБ ЗАЦВЕРДЖАННІ КАНСТЫТУЦЫІ (Асноўнага Закона) БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Надзвычайны XII З'езд Советаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі пастанаўляе:

Праект Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ў рэдакцыі, прадстаўленай Рэдакцыйнай Камісіяй З'езда, зацвердзіць.

Мінск, дом Урада
19 лютага 1937 г.

ПРЭЗІДЫУМ З'ЕЗДА.

ГРЫГОРЫЙ КАНСТАНЦІНАВІЧ ОРДЖАНІКІДЗЕ

МАСКВА, ЦК ВКП(б)

ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Надзвычайны XII Усебеларускі З'езд Советаў разам з усёй партыяй, разам з усёй краінай глыбока сумуе аб найцяжэйшай страце — смерці аднаго з любімейшых кіраўнікоў нашай партыі, члена Палітбюро ЦК ВКП(б), Наркома Цяжкай Прамысловасці СССР — таварыша Грыгорыя Канстанцінавіча Орджанікідзе.

Слаўны кіраўнік цяжкай індустрыі нашай соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, верны баец за адзінства партыі, за комунізм тав. Орджанікідзе карыстаўся гарачай любоўю ў найшырэйшых масах народаў Совецкага Саюза.

Беларускі народ ніколі не забудзе той велізарнай ролі, якую адыграў тав. Орджанікідзе ў вызваленні Беларусі ад белапалякаў. У ліпені 1919 года ў цяжкі момант тав. Орджанікідзе асабіста сам з невялікай групай чырвонаармейцаў хадзіў у разведку ў тыл белапалякаў і гэта забяспечыла ўзяцце Чырвонай Арміяй г. Барысава — беларускага Перакопа.

Пра гераічныя подвігі тав. Орджанікідзе, актыўна ўдзельнічаўшага ў вызваленні Беларусі ад белапольскай панскай акупацыі, ведае ўвесь беларускі народ. Аб гэтых подвігах таварыша Орджанікідзе спяваюцца песні, расказваецца ў вершах беларускага народу.

Надзвычайны XII Усебеларускі З'езд Советаў, які разглядае Канстытуцыю БССР, заснаваную на вялікай Сталінскай Канстытуцыі СССР, у якой падітожваюцца грандыёзныя завяёвы нашай партыі, рабочага класа і сялянства, адзначае тую велізарную ролю, якую адыграў т. Орджанікідзе ў барацьбе за ажыццяўленне ленінска-сталінскай генеральнай лініі нашай партыі, у барацьбе за пабудову соцыялізма, ажыццёўленага ў нашай краіне.

Беларускі народ па прыкладзе светлага большэвіцкага рэволюцыйнага жыцця тав. Орджанікідзе будзе вучыцца большэвіцкай стойкасці, уменню перамагаць і няўхільна змагацца за пабудову комуністычнага грамадства.

Надзвычайны XII Усебеларускі З'езд Советаў выказвае Вам, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, і ў вашым твары—усяму ЦК ВКП(б) сваё глыбокае спачуванне і запэўняе Вас і ЦК ВКП(б), што беларускі народ зробіць ўсё для перамогі комунізма, для абароны нашай радзімы, для ажыццяўлення вялікіх прынцыпаў, за якія так самааддана змагаўся наш баявы дарагі таварыш Серго Орджанікідзе.

ПРЭЗІДЫУМ З'ЕЗДА.

ПРАМОВА тав. А. Г. ЧАРВЯКОВА

НА ЗАКЛЮЧНЫМ ПАСЯДЖЭННІ НАДЗВЫЧАЙНАГА XII УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА СОВЕТАЎ 19 ЛЮТАГА 1937 ГОДА

Таварышы, атрымана наступнае ўрадавае паведамленне: «18 лютага, у 17 гадзін 30 мінут, у Маскве, у сябе на кватэры ў Крэмлі, ад параліча сэрца раптоўна памёр Народны Камісар Цяжкай Прамысловасці, член Палітбюро Цэнтральнага Камітэта ВКП (большэвікоў) таварыш Грыгорый Канстанцінавіч Орджанікідзе». **(Усе ўстаюць, і затым стоячы слухаюць астатнюю частку прамовы).**

Атрымана таксама тэлеграма ад Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), паведамленне ад Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і ўрачэбнае заключэнне аб смерці таварыша Грыгорыя Канстанцінавіча Орджанікідзе і паведамленне памяці таварыша Орджанікідзе, падпісанае таварышамі Сталіным, Молатавым, Кагановічам, Варашылавым і іншымі членамі Палітбюро, членамі ЦК ВКП(б) і ўрада.

Гэтыя паведамленні, як электрычны ток, патрасаюць кожнага з нас, патрасаюць кожнага рабочага, калгасніка, кожнага працоўнага Совецкай Беларусі.

Тав. Орджанікідзе належаў да тых вялікіх кіруючых работнікаў, саратнікаў вялікага Сталіна, якіх ведаюць у кожным кутку Совецкай Беларусі. Няма такога завода, такога калгаса, такой установы, дзе-б не ведалі і не любілі тав. Орджанікідзе.

Гэта любоў з'яўляецца вынікам высокіх якасцей тав. Орджанікідзе, як большэвіка, як комуніста, як спадвіжніка Леніна, як спадвіжніка Сталіна.

Гэта любоў вынікае з той вялікай ролі, якую адыграў тав. Орджанікідзе ў часы грамадзянскай вайны, у барацьбе за вызваленне Беларусі ад белапольскай акупацыі. Будучы членам Рэволюцыйнага ваеннага совета 16-й арміі, тав. Орджанікідзе сам з групай чырвонаармейцаў хадзіў у разведку на польскім фронце пад Барысавам. І гэта разведка, раскрыўшая ў пэўнай меры карты польскага камандавання, з'явілася адным з важнейшых момантаў у прарыве польскага фронта, у знішчэнні польскай акупацыі, у вызваленні Беларусі ад белапалякаў.

Вось чаму ўспамінамі аб вызваленчі Беларусі ад белапольскіх акупантаў беларускі народ славіў і славіць імя тав. Орджанікідзе, як аднаго з тых, пад кіраўніцтвам якога беларускі народ дабіўся свайго вызвалення.

Калі мы звернемся да гісторыі будаўніцтва соцыялізма ў Беларусі, мы павінны таксама адзначыць тую вялікую ролю, якую адыграў тав. Орджанікідзе ў справе соцыялістычнага будаўніцтва і арганізацыі новых прамысловых прадпрыемстваў, у выніку чаго Совецкая Беларусь ператварылася ў краіну індустрыяльна-аграрную.

Пастаянная дапамога ў вырашэнні задач соцыялістычнага будаўніцтва, яго сардэчныя, яго таварыскія, яго дружаственыя адносіны да Совецкай Беларусі, яго дружаственыя, яго сталінскія адносіны, як друга, да беларускага народу, — усё гэта стварыла велізарнейшы аўтарытэт тав. Орджанікідзе, усё гэта зрабіла яго імя знаёмым у кожным кутку Совецкай Беларусі.

Вось чаму, таварышы, працоўныя Совецкай Беларусі з асаблівым жалем, з глыбокім смуткам перажываюць гэту незваротную страту нашай партыі, незваротную страту нашага соцыялістычнага грамадства. Аднак, таварышы, у гэты момант мы не павінны аддавацца роспачы; мы павінны памятаць тое, як працаваў тав. Орджанікідзе і падражаць яму ў нашых паводзінах, у нашай рабоце, у нашай барацьбе. І гэта падказвае нам, што неабходна яшчэ больш шчыльна аб'яднаць нашы рады вакол нашай партыі, вакол сталінскага ЦК ВКП(б), вакол правадыра народаў таварыша Сталіна для таго, каб, займаючы алказнейшы ўчастак на мяжы з капіталістычным светам, працягваць несупынную барацьбу і забяспечыць новыя бліскучыя перамогі ў барацьбе за комунізм.

І нам думаецца, што лепшым помнікам тав. Орджанікідзе ў Совецкай Беларусі будзе наша згуртаванасць вакол партыі Леніна — Сталіна, наша самаадданасць у барацьбе за справу соцыялізма, наша вернасць партыі Леніна — Сталіна, наша вернасць правадыру народаў таварышу Сталіну.

Прапануецца, таварышы, ад імя Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Советаў накіраваць таварышу Сталіну наступную тэлеграму. **(Тав. Чарвякоў зачытвае і галасуе тэкст тэлеграмы таварышу Сталіну, якая надрукавана ў сённешнім нумары «Звязды».** Тэлеграма аднагалосна прымаецца З'ездам).

Мы працягваем сваю работу з імем тав. Орджанікідзе на вуснах.

НА ЗДЫМКУ: таварыш Г. К. Орджанікідзе ў труне ў Калонным зале Дома Саюзаў.

Фото Ф. Кіслова і С. Ласкутова (СФ). Атр. па більд. апарату Бел. кір. сувязі.

ГІСТАРЫЧНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

Ніжэй мы публікуем чатыры дакументы, якія характарызуюць рэволюцыйную дзейнасць т. Орджанікідзе на тэрыторыі Беларусі. Сярод іх два дакументы, якія датычаць 1917 года—перыяда барацьбы за ўмацаванне совецкай улады ў Беларусі. Наступныя дакументы датычаць 1919 года і адносяцца да перыяда барацьбы белапольскай інтэрвенцыі.

У лістападзе 1917 года сабраўся франтавы з'езд салдат Заходняга фронта. Гэта быў першы франтавы з'езд пасля захвату ўлады пролетарыятам. ЦК РСДРП (большэвікоў), надаючы вялікае значэнне гэтаму з'езду, камандыраваў на яго сваім прадстаўніком тав. Орджанікідзе. Выступленне тав. Орджанікідзе арыграла рашаючую ролю—хістанні, якія мелі месца сярод частні салдат да выступлення т. Орджанікідзе, спыніліся. Авацыяй з'езд сустрэў прапанову тав. Орджанікідзе, абраннi В. І. Леніна ганаровым старшынёй з'езда.

У сваім выступленні 22 лістапада 1917 года тав. Орджанікідзе па-майстэрску паказаў класавую сутнасць насілля, прымяняемага пролетарскай дыктатурай, выкрыўшы меншавіцкія і эсэраўскія размовы аб насіллі наогул.

Членам Рэволюцыйнага Ваеннага Совета XVI арміі, якая абараняла подступы да Менска, тав. Орджанікідзе быў назначан па настойлівасці таварыша Сталіна, які прыязджаў на белапольскі фронт у ліпені 1919 года.

У сярэдзіне жніўня 1919 года, калі белапалякамі быў узят г. Барысаў, тав. Орджанікідзе на чале невялікай групы чырвонаармейцаў прабраўся ў горад, каб разведаць сілы праціўніка. Гэта разведка дала магчымасць Чырвонай Арміі правесці рад рашаючых аперацый. Пасля разведкі чырвонаармейскія часці кароткім ударам выбілі белапалякаў з г. Барысава. У гэты-ж перыяд тав. Орджанікідзе распрацоўвае план абароны ўсяго ўчаска фронта ад Полацка да Бабруйска (загад № 155). Гэтыя дакументы сведчаць аб велізарнейшай ролі тав. Орджанікідзе ў барацьбе за вызваленне Беларусі ад белапольскай інтэрвенцыі.

Апошняе з публікуемых дакументаў — пісьмо тав. Орджанікідзе на імя Цэнтральнага Камітэта РКП(б) і таварыша Сталіна. У ім выкрываюцца трацкісцкія скажэнні лініі партыі ў ваенным пытанні і прапануецца чоткая і ясная сталінская лінія ўзмацнення комуністычных элементаў у Чырвонай Арміі.

ПРАМОВА таварыша ОРДЖАНІКІДЗЕ

(Менск, 20 лістапада 1917 г.)

Старшыня тав. Мяснікоў прадастаўляе слова тав. Орджанікідзе, які выступае ад імя ЦК РСДРП. (З'езд авацыямі сустракае тав. Орджанікідзе).

ОРДЖАНІКІДЗЕ (ЦК РСДРП): Наша партыя падвяргалася не толькі ганенням буржуазіі, але і тых соцыялістычных партый, якія 8 месяцаў былі на чале краіны.

Нас падвяргалі ганенням урад Керэнскага і Аўксенцьева. Нас праследвалі за тое, што мы стаялі за ўладу працоўнага народу. Нас праследвалі і за тое, што мы стаялі за зямлю і за мір.

Прамоўца дае аналіз знешняй палітыцы звергнутай улады, абмалёўвае ўмовы, у якіх утварыўся пераход улады да большэвікоў, і прадстаячыя задачы.

Прамова перарываецца частымі апладысментамі.

«Звезда», № 37 (74), 1917 год, 22 лістапада.

ВЫСТУПЛЕННЕ таварыша ОРДЖАНІКІДЗЕ

(Менск, 22 лістапада 1917 года)

... Тав. Орджанікідзе гаворыць, што калі германскі і аўстрыйскі міністры згодны на наш мір, то гэта адбываецца толькі пад напіскам масавага руху рабочых. Гэта рэзультат нашай рэволюцыі, якая знаходзіць водгукі ў працоўных масах усяго свету. Нас папракаюць за гвалт, за разгон Петраградскай і Магілеўскай гарадскіх дум, за закрыццё газет. У нашай доўгай барацьбе з царызмам гвалт нам настолькі абрыдзеў, што абараняць яго цяжка. Але ёсць гвалт гвалту. Калі мы ў лютым нізкерглі Нікалая, то гэта быў гвалт. Але хто стане адмаўляць права народных мас на такі гвалт. Маскоўскі гарадскі галава Руднёў прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы ўзбросенага выступлення супроць народу, а ўся Дума ішла за ім. Гэта было гняздо контрэволюцыі. Мы сказалі, праверым ці выражаеце вы яшчэ пяпер думку народу, або не. Гэтага ніхто не павінен баяцца. Нас папракаюць у закрыцці газет, але мы закрылі тыя газеты, якія друкавалі адозву старога нізвергнутага ўрада, якія падтрымлівалі яго. Ёсць гвалт і гвалт. Мы супроць гвалту кучкі памешчыкаў над сялянамі, мы супроць гвалту фабрыканта над рабочымі, але мы не можам выказацца супроць гвалту прыгнечаных пад прыгнятальнікамі, каб вызваліцца. Таму мы за гвалт над памешчыкамі дзеля ўрачыстасці сялян, мы за гвалт над буржуазіяй у імя вызвалення рабочых.

«Звезда» № (76), 24 лістапада 1917 г.

Загадам Рэволюцыйнага Ваеннага Совета Рэспублікі па асабоваму саставу арміі № 143 ад 24 ліпеня 1919 года тав. Серго Орджанікідзе назначан членам Рэволюцыйнага Ваеннага Совета XVI арміі.

У ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ РКП
(Масква)

Копія: ЧЛЕНУ РЭВОЛЮЦЫЙНАГА СОВЕТА ЗАХОДНЯГА ФРОНТА тав. СТАЛІНУ

Паважаныя таварышы!

У той час, як лініяй паводзін партыі ў пытаннях ваеннага будаўніцтва з'яўляецца ўзмацненне значэння комуністычных элементаў у арміі і паступовае вызваленне яе ад выключнага ўплыву ваенных спецыялістаў старога рэжыму, адным з апошніх актаў Рэволюцыйнага Ваеннага Совета Рэспублікі аказалася мерапрыемства, якое, не гледзячы на свой здавалася-б тэхнічна-спецыяльны характар, стварае самыя сур'ёзныя перашкоды да правядзення гэтай лініі рэвваенсоветамі армій...

Член Рэвваенсовета XVI арміі Орджанікідзе.

ВЫДАТНЕЙШЫ БАРАЦЬБІТ ЗА СОЦЫЯЛІЗМ.

Найглыбейшым смуткам адгукнецца смерць тав. Серго Орджанікідзе ў сэрцах працоўных усяго свету, вызваленню якіх ён аддаў свой светлы розум, сваё палкае сэрца, сваю кіпучую энергію, усё сваё выдатнае жыццё рэволюцыянера, байца і правадыра народных мас.

Ушоў слаўны спадвіжнік Леніна і Сталіна, іх вярнейшы друг, іх надзейны саратнік, спаяны з імі дзесяцігоддзямі агульнай работы, барацьбы, мыслі і волі да перамогі.

Усё жыццё Серго Орджанікідзе неразрыўна звязана з гісторыяй рабочага руху, гісторыяй партыі большэвікоў, гісторыяй Вялікай пролетарскай рэволюцыі і набудаваннем соцыялізма ў СССР. Ніколі не згінаўшыйся прадстаўнік старой большэвіцкай гвардыі, ён разам з Леніным і Сталіным і пад іх кіраўніцтвам будаваў у найцяжэйшых умовах царскага падполля большэвіцкую партыю. Разам з Леніным і Сталіным ён вёў працоўныя масы на чале з партыяй большэвікоў да перамогі ў кастрычніку 1917 года. Разам з Леніным і Сталіным, поплеч з Варашылавым і забітым злодзейскай трацкісцка-зіноўеўскай зграяй Кіравым, у гады грамадзянскай вайны ён — бліскучы арганізатар перамогі складваўшайся малодой Чырвонай Арміі над сіламі інтэрвентаў і белагвардзейскіх полчышчаў. Сярод ленінска-сталінскай нагорты ён — жалезны нарком, які вынёс велізарны цяжар практычнай работы па будаўніцтву соцыялізма ў СССР.

Смерць вырвала з нашых радоў аднаго з самых лепшых людзей сусветнага пролетарыята, выдатнейшага пролетарскага дзяржаўнага дзеяча, чалавека, увасобіўшага ў сабе каштоўнейшыя якасці комуніста-барацьбіта, у момант, калі яго невычарпальная энергія, яго незвычайныя здольнасці, яго велізарны вопыт так неабходны комуністычнай партыі Совецкага Саюза, краіне соцыялізма і ўсяму міжнароднаму рабочаму класу.

Усё жыццё, уся дзейнасць Серго Орджанікідзе будуць служыць прыкладам для кадраў усяго міжнароднага рабочага руху. На ўроках гэтага выдатнага жыцця будуць вучыцца пакаленні рабочых усіх краін, як трэба жыць, змагацца, пераадольваць труднасці і перамагаць.

Памёр адзін з самых выдатнейшых барацьбітоў чалавецтва за соцыялізм.

Выканаўчы Камітэт Комуністычнага Інтэрнацыянала выказвае ад імя мільёнаў працоўных усяго свету свой найглыбейшы смутак з поваду пяжкай страты, якую панеслі Усесаюзная комуністычная партыя (большэвікоў), народы вялікай краіны советаў і сусветны пролетарыят.

Комуністычны Інтэрнацыянал схіляе свае баявыя сцягі перад светлай памяццю гэтага вялікага рэволюцыянера, узорнага большэвіцкага кіраўніка мас у барацьбе супроць класавага ворага, арганізатара найвялікшых перамог на фронце будаўніцтва соцыялістычнай індустрыі і ў галіне абароназдольнасці совецкай радзімы — бацькаўшчыны працоўных усяго свету — нашага любімага і незабыўнага Серго.

ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА.

АД ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і ўвесь беларускі народ глыбока сумуе па поваду заўчаснай смерці аднаго з старэйшых большэвікоў ленінскай гвардыі, выдатнейшага дзеяча нашай партыі і совецкай дзяржавы, арганізатара соцыялістычнай прамысловасці, бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна — Грыгорыя Канстанцінавіча Орджанікідзе.

Беларускі народ ніколі не забудзе геройскіх подвігаў тав. Серго Орджанікідзе ў баях за вызваленне Беларусі ад белапольскай акупацыі.

Беларускі народ у сваіх песнях і творах успявае гэтыя подвігі таварыша Серго Орджанікідзе, бясстрашнага байца, які не толькі кіраваў і арганізоўваў барацьбу за вызваленне Беларусі, але сам з атрадам чырвонаармейцаў хадзіў у разведку ў тыл белапалякаў і тым самым забяспечыў перамогу Чырвонай Арміі на Бярэзіне ў г. Барысаве.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР таксама ніколі не забудуць той велізарнейшай ролі, якую адыграў тав. Орджанікідзе ва ўздыме соцыялістычнай прамысловасці ў БССР.

Светлы вобраз Серго Орджанікідзе, яго слаўнае жыццё рэволюцыйнага барацьбіта і будаўніка соцыялізма ў Саюзе ССР будуць жыць у сэрцах усіх працоўных Беларусі і служыць прыкладам у далейшай барацьбе за справу комунізма.

Яшчэ шчыльней згуртуем нашы рады вакол партыі Леніна — Сталіна, вакол ЦК ВКП(б) і любімага правадыра таварыша Сталіна.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР.
Совет Народных Камісараў БССР.

ГРЫГОРЫЙ КАНСТАНЦІНАВІЧ ОРДЖАНІКІДЗЕ

РАЗВЕДКА СЕРГО Ў ТЫЛУ БЕЛАПАЛЯКАЎ

Цяжкая страта. Для працоўных Совецкай Беларусі вестка аб смерці Серго Орджанікідзе асабліва цяжкая, бо з яго імем звязана перамога Совецкай Беларусі над польскімі акупантамі, з яго імем звязана шчаслівае сёнешняе жыццё беларускага народу.

Мне ўспамінаецца адзін выпадак, адзін маленькі эпізод з велізарнай работы Орджанікідзе па вызваленню Совецкай Беларусі ад польскай белагвардзейшчыны. Гэта было ў жніўні 1919 года. Пад напорам белапольскіх банд нашы часці Чырвонай Арміі былі вымушаны пакінуць Барысаў і адыйсці на ўсход да ст. Прыяміна. Туды-ж эвакуяваўся і павятовы рэўком.

Назаўтра, пасля заняцця белапалякамі Барысава, рэўком праз мясцовых жыхароў атрымаў весткі аб колькасці і размяшчэнні непрыяцеля. Гэтыя весткі мелі вельмі вялікую каштоўнасць таму, што становішча сувязі і разведкі ў нашых часцях было нездавальняючае. Палявы штаб 16 арміі, які знаходзіўся тады ў 20 кіламетрах ад Барысава, атрымліваў супярэчлівыя данясенні аб размяшчэнні праціўніка. Весткі, якія атрымаў рэўком, былі перададзены ў палявы штаб, члену Рэўваенсовета 16 арміі тав. Орджанікідзе.

Тав. Орджанікідзе парашыў неадкладна арганізаваць разведку ў Барысаў, выказаўшы пры гэтым жаданне асабіста прыняць удзел у гэтай аперацыі.

Вечарам таго-ж дня каля 10 чырвонаармейцаў і некалькі членаў барысаўскага рэўкома (у тым ліку і я) на чале з тав. Орджанікідзе пайшлі пяшком у напрамку да гор. Барысава. Часцей Чырвонай Арміі наперадзе не было. Патрабавалася выключная насцярожлівасць. Адвага і храбрасць Серго, які ішоў наперадзе з вінтоўкай у руках, натхняла ўсіх. Сцежкамі і прасёлачнымі дарожкамі, праз лясы, прайшоўшы больш 20 кіламетраў, Серго прывёў разведку да самага Барысава. Дакладна ўстанавіўшы размяшчэнне белапалякаў, тав. Орджанікідзе зноў вярнуўся ў штаб арміі.

Гэта разведка адыграла вялікую ролю ў справе выцяснення белапалякаў з Барысава, бо адразу пасля яе часці Чырвонай Арміі перайшлі ў наступленне, і праціўнік быў адкінут за раку Беразіну. Рэўком па распараджэнню тав. Орджанікідзе вярнуўся зноў у Барысаў.

Факт аб смелай разведцы тав. Орджанікідзе хутка стаў вядомы не толькі ў часцях арміі, але і сярод насельніцтва. Працоўныя Барысава выказвалі сваё захапленне гераізмам Серго. Сваё вызваленне ад белапольскіх пакут яны адносілі асабіста яго заслугам.

Гераізм і адвага слаўнага кіраўніка баёў з белапалякамі доўга астанецца ў памяці працоўных Совецкай Беларусі. Гэты гераізм і адвага будзе служыць узорам для ўсіх рабочых і калгаснікаў БССР, узорам таго, як трэба змагацца за справу пролетарскай рэволюцыі, за заваёвы Кастрычніка.

М. МАТУСЕВІЧ.
Намеснік наркома фінансаў БССР, былы член Барысаўскага павятовага ваенрэўкома.

БЫВАЙ, ДАРАГІ І ЛЮБІМЫ СЕРГО!

Тэлеграф прынёс душараздзіральную вестку. Не стала дарагога Серго. Смерць спыніла кіпучую дзейнасць аднаго з самых выдатных кіраўнікоў нашай партыі і краіны, вучня бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна — дарагога Серго.

Успамінаю, як быццам яшчэ нядаўна, у 1921-23 годзе тав. Серго членам Рэўваенсовета XI Арміі. Адно яго з'яўленне ў штабе арміі ўносіла ажыўленне і натхняла на новыя перамогі.

Да тав. Серго прыходзілі наркомы, ваенныя работнікі, сакратары павятовых камітэтаў і райкомаў, старшыні павятовых камітэтаў і райвыканкомаў для таго, каб атрымаць ад яго ўказанні і парады ў сваёй рабоце. Ён усіх уважліва выслухоўваў і ўсе ўходзілі ад тав. Серго — выпрабаванага большэвіка ленінца-сталінца, — атрымаўшы вычарпальныя ўказанні і парады па ўсіх пытаннях.

Яшчэ, як быццам зусім нядаўна, успамінаю аднаго з буйнейшых арганізатараў перамог Чырвонай Арміі тав. Серго вярхом на кані, прымаючага парад войск XI Арміі.

Імя тав. Серго асабліва дорага для працоўных Закаўказзя. З яго імем звязана вызваленне Азербайджана, Грузіі і Арменіі ад уціску сацыял-здраднікаў дашнакаў, меншавікоў і мусаватыстаў. З яго імем звязана пераможнае будаўніцтва соцыялізма ў Закаўказзі.

Праклятая смерць абарвала выдатнае жыццё непахіснага большэвіка і нястомнага арганізатара соцыялістычных перамог прамысловасці Саюза, саратніка вялікага Сталіна — тав. Орджанікідзе.

Павысіўшы рэволюцыйную пільнасць, работнікі прамысловасці яшчэ шчыльней згуртуюць свае рады і завершаць справу, за якую аддаў усё жыццё Серго.

Бывай, дарагі, родны і любімы Серго.

ГЕАРГАДЗЕ.

АБ ТАВАРЫШУ СЕРГО

Няма завода, фабрыкі, дзе не ведалі-б слаўнага камандарма цяжкай прамысловасці тав. Серго. Тав. Серго быў палкім, таленавітым кіраўніком вялікай арміі тварцоў соцыялістычнай індустрыі. Пад яго кіраўніцтвам вырастала навейшая тэхніка, узнікалі, будаваліся, пускаліся ў ход прамысловыя гіганты. Соцыялістычная краіна вызвалілася ад імпарту складаных машын, хімікатаў, рознастайнага абсталявання. Усё гэта вырабляецца на заводах соцыялістычнай прамысловасці. Ажыццёўлена было тое, аб чым пісаў тав. Серго ў сваёй запісцы XVI з'езду партыі. СССР з краіны, якая ўвозіла машыны і абсталяванне, ператварылася ў краіну, якая вырабляе машыны і абсталяванне. Разбіты ўсе надзеі ворагаў соцыялістычнай будоўлі на ператварэнне СССР у прыдатак капіталістычнай сусветнай гаспадаркі. Баец-большэвік, баец на франтах грамадзянскай вайны тав. Серго—верны саратнік таварыша Сталіна, быў слаўным байцом-кіраўніком гіганцкі вырасшай соцыялістычнай індустрыі.

Тэмпераменты, гарачы тав. Серго не шкадаваў зазнаваючыхся, адсталых. Ён патрабаваў ад усіх кадраў прамысловасці і ў першую чаргу ад яе камандзкага састава вучобы, удасканалення ў навуцы, тэхніцы, авалодання тэорыяй і практыкай. І побач з гэтым — здзіўляючая пяшчотнасць у адносінах да тых людзей, якія паказвалі прыклады шырокага размаху, тэхнічнай ініцыятывы, да тых, хто быў сапраўднымі большэвікамі-творцамі.

Тав. Серго з велізарнай смеласцю і рашучасцю высоўваў кіраўнікамі буйных прадпрыемстваў, трэстаў маладыя сілы. Ён моцна папярэджваў гаспадарнікаў, што, калі яны адстануць, то будуць хутка заменены новымі сіламі, авалодаўшымі тэхнікай.

Занадта нечакана ўшоў ад нас жыццерадасны, выключна цвёрды і чароўны тав. Серго. Але велізарная армія рабочых, інжынэраў, тэхнікаў, тыя, каго так любіў і пеставаў на соцыялістычнай будоўлі тав. Серго, — уся працоўная армія нашай радзімы далей пойдзе пад сцягам нашай вялікай партыі да новых перамог соцыялістычнай індустрыі.

А. ЛЮБОВІЧ.
Старшыня Дзяржплана БССР.

НА ЗДЫМКУ: таварыш Серго Орджанікідзе ў батумскай турме ў 1908 годзе. Здымак зроблен у свой час турэмным фатографам.

ЛЮБІМЫ КАМАНДАРМ

Памёр Серго. Гэтыя два словы напаўняюць горычу і глыбокім смуткам сэрца кожнага працоўнага нашай вялікай соцыялістычнай радзімы, яны асабліва патрасаючы для тых, каму калі-небудзь выпала шчасце бачыць або чуць гэтага выдатнага чалавека, аднаго з самых бліжэйшых саратнікаў Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

З імем тав. Орджанікідзе звязана развіццё цяжкай прамысловасці і станкабудаўніцтва ў Беларусі. Ён быў першым арганізатарам гэтай справы. Яго спецыяльныя загады з'явіліся рухаючай сілай у развіцці гэтай важнейшай галіны прамысловасці. Серго асабіста займаўся пытаннямі будаўніцтва металапрадпрыемстваў у БССР.

Мне ўспамінаецца 1935 год, калі мы не маглі сваімі сіламі скончыць будаўніцтва механазборачнага цэха завода імя Кірава. Мы звярнуліся з пісьмом да тав. Орджанікідзе, напісалі яму аб прычынах зацяжкі будаўніцтва: не было неабходных матэрыялаў — цэменту, жалеза, электраабсталявання і інш. Серго асабіста азнаёміўся з пісьмом, і праз кароткі час мы атрымалі ўсе патрэбныя матэрыялы. Калі я прышоў у сакратарыят тав. Орджанікідзе, там ужо было дакладнае ўказанне наркома кожнаму Главку ў асобку колькі і якіх матэрыялаў ён павінен адпусціць на сканчэнне будаўніцтва цэха завода імя Кірава.

Серго бясконца шмат працаваў, не шкадуючы сіл і здароўя. Памятаю, аднойчы я прышоў раніцай у наркамат цяжкай прамысловасці. Ні аднаго работніка апарата яшчэ не было. І раптам у карыдоры, ля ўваходу ў прыёмную наркома, я ўбачыў Серго. Ён гутарыў аб чымсьці з прыбіральшчыцамі. Аказваецца, Серго прышоў ужо на работу, не гледзячы на такі ранні час.

Серго карыстаўся бязмежнай любоўю і велізарным аўтарытэтам ва ўсіх работнікаў сістэмы Наркамцяжпрома. Яго слова было законам. Не раз бывала, калі работнікі з месц доўга спрачаліся ў апараце наркамата пры вызначэнні планаў або размераў асігнаванняў. Але варта было толькі ўпамянуць, што «так сказаў Серго», як усякія спрэчкі спыняліся.

Мне прышлося бачыць тав. Орджанікідзе не толькі ў наркамаце. У канцы 1936 года я бачыў яго ў Кіславодску, дзе Серго адпачываў будучы ў водпуску. Але і тут кіпучая дзейнасць наркома праяўлялася на кожным кроку. Серго можна было бачыць часта на будаўніцтве санаторыя Наркамцяжпрома ў Кіславодску. Ён уважліва сачыў за ходам будаўніцтва, дапамагаў яму.

Тав. Орджанікідзе паказваў выключныя ўзоры чуласці, уважлівых адносін да чалавека, працаздольнасці і баявога большэвіцкага кіраўніцтва. У Серго нам трэба вучыцца працаваць, уменню кіраваць.

Цяжка і немагчыма забыць такога чалавека.

А. Я. ЛЕВІН,
Кіраўнік Белмашстанкатрэста БССР.

ПАЛКІ БАРАЦЬБІТ ЗА СПРАВУ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

Смерць адабрала жыццё палкага ленінца-сталінца таварыша Грыгорыя Канстанцінавіча Орджанікідзе.

Цяжка верыцца, што яго з намі ўжо няма. Калі ўспамінаеш аб сваіх сустрэчах з таварышам Орджанікідзе Г. К., то бачыш яго жывога, палкага, загартаванага ў баях большэвіка.

Першая блізкая сустрэча з ім і знаёмства — гэта ў 1921 годзе на Паўночным Каўказе. Тады тав. Орджанікідзе ў гутарцы расказваў аб праведзімай барацьбе нашай Чырвонай Арміяй супроць белагвардзейскіх полчышчаў у Закаўказзі, і з якой радасцю ён расказваў аб тых велізарных поспехах у справе ачышчэння Закаўказзя ад белагвардзейскіх полчышчаў. Велізарная яго заслуга заключалася ў тым, што ён узнімаў вялікія сілы Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, і белагвардзейскія банды былі разбіты — у Закаўказзі пад яго кіраўніцтвам была аднаўлена совецкая ўлада.

Наступныя маі сустрэчы з тав. Орджанікідзе былі на партыйных з'ездах, пленумах ЦК партыі. Заўсёды бачны быў у ім яркі вобраз палкага большэвіка за ўмацаванне ленінска-сталінскай партыі. Ён у бязлітаснай барацьбе з усякага роду ўхіламі ад лініі партыі быў непрымірымым.

Мая сустрэча з тав. Орджанікідзе была таксама і па гаспадарчай рабоце. Ён асабліва заўсёды ставіў пытанне аб уважлівых і чулых адносінах да шырокіх рабочых мас; заўсёды праяўляў клопаты аб іх быце і здароўі.

Таварыш Серго памёр, але яго большэвіцкая стойкасць і ленінска-сталінская загартоўка будуць незгладжаныя для шырокіх мас працоўных, і тая справа, за якую ён змагаўся, — будзе служыць прыкладам для ўсіх нас. На яго велізарнейшым вопыце маладое падрастаючае пакаленне будзе будаваць соцыялізм, за які аддаў сваё жыццё тав. Орджанікідзе.

Згуртуем-жа мацней рады вакол ленінска-сталінскага ЦК і правадыра сусветнага пролетарыята таварыша Сталіна.

А. ЦІХОН.

СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ БАРАЦЬБІТА ЗА СОЦЫЯЛІЗМ

Толькі нядаўна мы віталі тав. Серго Орджанікідзе ў дзень яго 50-годдзя. Вялікі совецкі народ у сваіх прывітаннях выказваў тав. Серго, старому большэвіку з ленінскай гвардыі, стойкаму барацьбіту за адзінства партыі, таленавітаму арганізатару і кіраўніку бліскучых перамог нашай цяжкай індустрыі сваю велізарную любоў. Увесь яго выдатны шлях барацьбы большэвіка — прыклад для нас.

Серго адзін з тых, хто правёў нашу вялікую краіну праз суровыя іспыты і цяжкасці да радаснага жыцця.

Серго — адзін з тых, хто пад кіраўніцтвам геніяльнага Сталіна няўтомна будаваў праменісты будынак соцыялізма. Заўсёды жыццерадасны, няўтомны, перагружаны велізарнай творчай работай, ён прыслухоўваўся да голасу мас і ў гэтых масах чэрпаў натхненне і намёткі шляхоў далейшай работы.

Няўтомны барацьбіт на барыкадах, у большэвіцкім падполлі, у Чырвонай Гвардыі і Чырвонай Арміі, на фронце мірнага соцыялістычнага будаўніцтва, Серго ўпісаў у гісторыю нашай вялікай партыі Леніна — Сталіна многа яркіх старонак.

У 1931 годзе на з'ездзе гаспадарнікаў тав. Орджанікідзе падвяргаў рэзкай крытыцы работу нашых гаспадарчых аб'яднанняў. У сваёй рабоце ён рашуча граміў контррэволюцыйных трацкістаў і іх саюзнікаў з лагера правых. Мне, працаваўшаму разам з ім, было відаць, з якой любоўю і адданасцю ён сачыў і непасрэдна кіраваў складаннем кантрольных лічбаў прамысловасці, з якой дакладнасцю ён выяўляў нашы патэнцыяльныя магчымасці, з якой любоўю выхоўваў ён кадры гаспадарнікаў, з якой увагай ён сачыў за работай Прамысловай акадэміі.

Успамінаю яго на пуску Бобрыкаўскага камбіната. З якой дакладнасцю ён сачыў за бытавымі ўмовамі жыцця рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Ён абышоў і азнаёміўся з усімі цэхамі камбіната. Многа і доўга абмяркоўваў пытанні будаўніцтва другой чаргі.

Тав. Серго пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна стварыў і значна ўзмацніў нашу абаронную прамысловасць.

Ён многа аддаваў увагі стварэнню ў нас магутнай азотнай прамысловасці, пытанням апалу, энергетыкі, аўтаматорнай прамысловасці, метала, машынабудаўніцтва і асабліва ўкараненню навейшай тэхнікі.

На пасадзе галоўнага хіміка Оргхіма мне прыходзілася бываць у яго. Успамінаю асабістыя гутаркі з ім па пытаннях рацыяналізацыі вытворчасці хімзаводаў. З якой дасканаласцю тав. Серго сачыў за арганізацыяй кантролю за вытворчасцю, за якасцю прадукцыі. Доўга за поўнач можна было застаць яго ў рабочым габінэце ў Наркамцяжпроме. Тав. Серго асабліва многа ўвагі аддаваў пытанням тэхнічнай інфармацыі, арганізацыі ў СССР выставак лепшага тэхнічнага абсталявання і каталагаў.

Яшчэ цясней згуртуемся вакол комуністычнай партыі і вялікага Сталіна. Лепшай работай, згуртаванасцю, большэвіцкай пільнасцю заменім велізарную страту, якую панесла наша партыя і ўсе працоўныя Совецкага Саюза.

Праф. Б. ШПЕНЦЭР.

ВЯЛІКІ РЭВОЛЮЦЫЯНЕР-БОЛЬШЭВІК

Жалобай агорнута ўся наша Совецкая краіна. Востры боль вялікай незваротнай страты адчувае кожны працоўны, кожны грамадзянін краіны соцыялізма: бязлітасная раптоўная смерць вырвала з сталёвай кагорты слаўнай гвардыі большэвікоў лепшага сына краіны, бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна, Грыгорыя Канстанцінавіча Орджанікідзе. Хто не ведаў гэтага светлага імя, гэтага выдатнага чалавека, чыё гарачае сэрца вялікага рэволюцыянера, нескрышальная воля і энергія былі цалкам адданы вялікай Совецкай краіне — яе абароне ў цяжкія гады грамадзянскай вайны, у гады мірнага будаўніцтва на стварэнне яе перадавой магутнай тэхнікі.

Чуткае чалавечае сэрца, чаруючы вобраз большэвіка-змагара за справу Леніна—Сталіна, ясны і шырокі розум — такі быў Грыгорый Канстанцінавіч. Народы самых аддаленых куткоў Совецкага Саюза горача, любоўна і радасна вымаўлялі гэта імя, як сімвал нашай тэхнічнай магутнасці. Яго светлая памяць будзе вякамі жыць у сэрцах мільёнаў працоўных і будзе натхняць іх на змаганне за шчаслівае жыццё, за новую людскую грамаду, за трыумф ідэй комунізма.

Мір і спакой яго праху.

Я. КОЛАС.

БЕЛАРУСКІ НАРОД НІКОЛІ НЕ ЗАБУДЗЕ СВАЙГО ВЕРНАГА ДРУГА

(З ЗАЛЫ ПАСЯДЖЭННЯЎ НАДЗВЫЧАЙНАГА XII УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА СОВЕТАЎ)

У гэтай зале, дзе засядае гістарычны з'езд, чуваць жалобныя мелодыі аркестра.

Яшчэ зранку дэлегаты даведаліся аб цяжкай страце. Задумлены іх твары.

Многія, многія з седзячых у зале асабіста ведалі слаўнага сталінскага наркома — чалавека нястомнай энергіі, чыё сэрца раптоўна перастала біцца.

Погляды дэлегатаў накіраваны да прэзідыума, туды, дзе партрэт незабыўнага Серго і чырвоныя сцягі, абвітыя жалобнымі істужкамі.

Тав. Чарвякоў адкрывае пасяджэнне З'езда.

Ён чытае:

— **«Урадавае паведамленне. 18 лютага ў 17 гадзін 30 мінут у Маскве, у сябе на кватэры, у Крэмлі ад паралiча сэрца раптоўна памёр Народны Камісар Цяжкай Прамысловасці, член Палітбюро Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) (большэвікоў) таварыш Грыгорый Канстанцінавіч Орджанікідзе».**

З'езд стоячы слухае гэтую цяжкую вестку, якая выклікала неперадавальны боль і найвялікшае гора.

У напружанай цішыні агалошваецца паведамленне Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), ЦВК СССР, пісьмо таварыша Сталіна і тт. Молатава, Кагановіча, Варашылава, Чубара, Мікаяна, Касіора і іншых кіраўнікоў партыі і ўрада аб незабыўным вобразе мужнага чалавека, які ўсё сваё светлае жыццё «без астатку аддаў справе рабочага класа, справе вызвалення чалавецтва, справе комунізма».

— **«Цяжар гэтай страты незгладзімы. Яе з болем будуць перажываць усе працоўныя нашай краіны. Мы страцілі цябе ў момант, калі наша краіна дасягнула трыумфа соцыялізма. У гэтых перамогах, заваяваных намі шляхам вялікай барацьбы, — вялікая доля тваёй працы, тваёй энергіі, тваёй бязмежнай адданасці комунізму.**

Бывай, дарагі друг і таварыш Серго!»

Вялікі правадыр, мудры настаўнік, любімы Сталін і яго баявыя саратнікі выказалі думкі і пачуцці глыбокага жалю ўсяго шматмільённага совецкага народу.

Працоўныя Совецкай Беларусі ніколі не забудуць, як у часы грамадзянскай вайны тав. Орджанікідзе па-геройску змагаўся за вызваленне Беларусі ад белапольскіх акупантаў. Беларускі народ вечна будзе захоўваць у сваіх сэрцах памяць аб Серго, які па-сталінску клапаціўся аб росквіце соцыялістычнай індустрыі рэспублікі.

Тав. Чарвякоў гаворыць прамову, прысвечаную памяці Серго Орджанікідзе. І калі скончыліся яе апошнія словы, дэлегаты З'езда першыя свае думкі звяртаюць да таго, хто страціў свайго асабістага друга, да роднага бацькі народаў—да таварыша Сталіна.

У тэлеграме на імя Сталіна беларускі народ вуснамі лепшых сваіх выбраннікаў дае правадыру непарушную клятву і надалей быць беззаветна адданымі справе Леніна — Сталіна, справе комунізма. Жывучы на стыку з капіталістычным светам, беларускі народ з яшчэ большай энергіяй будзе ўмацоўваць магутнасць ордэнаноснай Совецкай Беларусі — надзейны заходні фарпост вялікага СССР, і пад сцягамі партыі Леніна — Сталіна, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна разам з усёй брацкай сям'ёй народаў СССР змагацца за новыя перамогі соцыялізма, за комунізм.

ЛЯ ТРУНЫ ВЯЛІКАГА РЭВОЛЮЦЫЯНЕРА

Зранку 19 лютага к Дому саюзаў, дзе знаходзіцца цела памёршага камандарма цяжкай індустрыі, рушылі дзесяткі тысяч людзей. І калі адчыніліся шырокія дзверы будынка, пачалося безупыннае шэсце праз Калонную залу.

Рабочыя, работніцы, служачыя, хатнія гаспадыні, студэнты, школьнікі праходзяць міма высокага пастамента, на якім устаноўлена труна з целам Серго Орджанікідзе. Ва ўрачыста-строгім бязмоўі павольна ідзе паток людзей. Яны безадрыўна глядзяць на пастамент, імкнучыся назаўсёды захаваць у памяці блізкае і чароўнае арлінае абліччэ выдатнага большэвіка, якога мільёны працаўнікоў ласкава называлі «Серго».

**

Масай жывых кветак акружан пастамент. Да згалоўя схіліліся сцягі, панікла кронамі зялёныя пальмы. Увітыя крэпам люстры ствараюць поўзмрок у зале, у цішыні якой журботна льюцца гукі жалобнага марша.

Ля труны, схіліўшы галаву, развітваецца з нябожчыкам яго верная баявая падруга Зінаіда Гаўрылаўна. Тут-жа бліжэйшыя прыяцелі і саратнікі. Сярод іх — таварышы Л. М. Кагановіч, Варашылаў, Мікаян, Акулаў, Стэцкі, Якаўлеў, Хрушчоў, Рухімовіч, М. М. Кагановіч і інш. Доўгія і доўгія мінуты стаяць яны ля сумнага падножжа, развітваючыся з бясконца дарагім, незабыўным...

Мяняецца ганаровая варта. Работнікі Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), Камісіі Партыйнага Кантроля, Камісіі Совецкага Кантроля, Маскоўскага камітэта ВКП(б), інстытута Маркса — Энгельса—Леніна, Народнага камісарыята цяжкай прамысловасці і іншых наркаматаў, раёнаў Масквы, гаспадарнікі, камандзіры Чырвонай Арміі аддаюць апошні доўг Грыгорыю Канстанцінавічу Орджанікідзе.

Ні на момант не спыняецца паток працоўных, якія жадаюць сказаць роднаму Серго апошняе «бывай». Невыразную горыч цяжкай страты нясуць сюды, у Калонную залу, шматлікія дэлегацыі індустрыяльных гігантаў сталіцы. Раніцой на заводах і фабрыках праходзілі жалобныя мітынгі рабочых, паслаўшых у Дом саюзаў сваіх таварышоў. Яны прышлі ад варштатаў, канвеераў, машын, ад прадпрыемстваў, створаных жалезнай воляй і неўгамаванай энергіяй Серго па сталінскаму плану індустрыялізацыі. Яны прышлі выказаць велізарны боль совецкага народу, развітацца з любімым народным камісарам цяжкай прамысловасці, палкім трыбунам, натхніцелем магутнага стаханаўскага руху, выдатным арганізатарам большэвіцкай партыі, аддаўшым усё, без астатку, да апошняга ўздоху сваё светлае велічнае жыццё справе рабочага класа, справе яго партыі, партыі Леніна—Сталіна.

**

Вось уваходзіць у залу дэлегацыя шарыкападшыпнікавага завода імя Л. М. Кагановіча. За будоўляй і ростам гэтага завода, як і соцень іншых прадпрыемстваў, уважлівым бацькаўскім вокам сачыў кожнадзённа камандарм цяжкай індустрыі. Дэлегаты беражна ўкладваюць вянок.

У новыя змены ганаровага караула становяцца тт. Будзённы, Эліява, Шварнік, Уншліхт, камандармы другога ранга Алкснiс, Седзякін, Халепскі, камкор Тодорскі, армейскі камісар 2-га ранга Аранштам, тт. Бубноў, Берыя, Мусабекаў, Багіраў. Бясшумна змяняецца вайсковы караул. Байцы Пролетарскай дывізіі ўшаноўваюць памяць таго, хто паклаў нямала сіл на ўмацаванне абароны краіны Совет, хто забяспечыў Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію магутнымі сродкамі абароны.

Гадзіна, другая, трэцяя, чацвёртая... Траурнае шэствіе прадаўжаецца. Новыя і новыя тысячы людзей праходзяць праз Калонную залу, развітваючыся з Серго.

Часам раздаюцца сударажныя ўсхліпванні, у многіх ціха льюцца слёзы.

Ганаровую вахту нясуць тт. Сулімаў, Лебедзь, Землячка, Таль, Адарацкі, Тупалеў, Корк, Ф. Кон, Кулькоў, Марголін, Калрытны, Філатаў, Каротчэнкаў, О. Ю. Шмідт, Вышынскі, пісьменнікі Стаўскі, Карнейчук, Кіршон, камандзір Пролетарскай дывізіі Петроўскі, прадстаўнікі заводаў і фабрык Масквы.

У 16 гадзін 50 мінут у залу ўносяць і ўстанаўліваюць ля падножжа труны вялікі вянок. На пунцовай ленце надпіс:

— Буйнейшаму дзеячу нашай партыі, палкаму, бясстрашнаму большэвіку-ленінцу—Грыгорыю Канстанцінавічу Орджанікідзе ад Цэнтральнага Камітэта ВКП(б).

У 16 гадзін 55 мінут у чарговую змену ганаровага караула становяцца таварышы Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Чубар.

Нерухома стаяць самыя блізкія прыяцелі Серго. Разам з імі ён змагаўся за трыумф перамогі соцыялізма, разам з імі ён бязлітасна паражаў ворагаў народу.

Прайшло 5 мінут. Таварышы Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян і Чубар групай падыходзяць бліжэй да труны. Яны ўглядваюцца ў любімы твар вялікага большэвіка.

**

У ганаровым карауле таварышы Дзімітраў, Мануільскі, Пятніцкі, іх змяняюць Літвінаў, Стаманякоў, М. М. Кагановіч, Агранаў, Крыленка.

6 гадзін вечара. Змрок пачынае ахутваць вуліцы. З усіх ускраін сюды, да Дома саюзаў, закончыўшы работу ў ранішняй змене, ідуць усё новыя і новыя калоны рабочых і служачых.

У ганаровым карауле таварышы Жданаў, Ежоў, Межлаук, Анціпаў, Хрушчоў, Гамарнік, Сулімаў, Косараў, Бауман. Іх змяняюць камандзіры Чырвонай Арміі, акадэмікі, стаханаўцы, работнікі навукі, літаратуры і мастацтва.

6 гадзін 20 мінут. Да згалоўя нябожчыка друга і саратніка зноў падыходзяць таварышы Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Чубар.

Яны стаяць, акружаныя цесным, рухаючымся кальцом народу. Аддаўшы апошняе «бывай» любімаму Серго, працоўныя накіроўваюць свой зрок да вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна. Яго твар, поўны несакрушальнай мужнасці і сілы, напаўняе сэрца кожнага працоўнага непахіснай упэўненасцю, натхняе на новыя подзвігі ў далейшай барацьбе за трыумф комунізма.

У 21 г. 15 м. у новай змене ганаровага караула стаяць таварышы Постышаў, Гамарнік, Будзённы, Якір, Хрушчоў, Анціпаў, Шварнік, Гікало.

За ўчарашні дзень праз Калонную залу міма труны Серго Орджанікідзе прайшло каля 250 тысяч чалавек. (БЕЛТА).

ГРЫГОРЫЙ КАНСТАНЦІНАВІЧ ОРДЖАНІКІДЗЕ

БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ ТАК, ЯК ПРАЦАВАЎ НАШ СЕРГО

Сотні рабочых менскага станкабудаўнічага завода імя Варашылава прышлі на жалобны мітынг, каб ушанаваць светлую памяць заўчасна памёршага дарагога наркома Серго Орджанікідзе.

У перапоўненым слясарна-зборачным цеху непарушная цішыня. Уважліва слухаюць рабочыя выступленне токара Шаўрава.

— У 1931 годзе я працаваў шахцёрам у Данбасе. Тады тав. Орджанікідзе прыехаў у Горлаўку. Нехапае слоў, каб расказаць аб тым узлыце, які выклікаў прыезд Серго Орджанікідзе ў шахцёраў. Ён доўга гутарыў з многімі рабочымі, падрабязна цікавіўся іх працай і жыццём. І калі ён выступіў у Палацы культуры ў Горлаўцы, то зала не магла змясціць усіх, жадаючых паслухаць прамову любімага наркома. Тутжа таварыш Орджанікідзе даў указанне неадкладна арганізаваць добрае забеспячэнне рабочых.

З выключным узлымам пачалі працаваць шахцёры пасля прыезду Серго. Мне вельмі цяжка гаварыць пра гэтага выдатнейшага чалавека пры думцы: што ён памёр.

Усе выступаўшыя рабочыя аднадушна заяўлялі:

— Мы будзем браць прыклад у сваёй стаханаўскай рабоце з нашага любімага наркома, які ўсё сваё жыццё аддаў справе партыі Леніна—Сталіна.

ЯШЧЭ ШЧЫЛЬНЕЙ ЗГУРТУЕМСЯ ВАКОЛ ЛЮБІМАГА СТАЛІНА

Пішыня. Рабочыя з напружаннем чакаюць пачатку мітынга, хочуць даведацца, што маглю раптам прыпыніць работу. І нішчам громам паражае ўсіх патрасаючае паведамленне: перастала біцца сэрца лепшага вучня і саратніка Леніна—Сталіна—Грыгорыя Канстанцінавіча Орджанікідзе.

З затоеным дыханнем слухалі рабочыя кароткі расказ аб выдатным жыццёвым шляху Серго.

Орджанікідзе—адзін з сталёвай ленінска-сталінскай кагорты большэвікоў, якая арганізавала і кіравала гістарычнымі бастрычніцкімі баямі, змагалася за перамогу маладой рэспублікі Советаў над інтэрвентамі і ўнутранымі ворагамі рэволюцыі.

Серго—крышталёва чысты большэвік, які ўсё сваё жыццё змагаўся за чыстату і адзінства ленінска-сталінскай партыі, за перамогу сацыялізма ў нашай краіне.

Орджанікідзе быў бязлітасны ў барацьбе з ворагамі народу — стаўленікамі бандыта Троцкага і іх саюзнікамі—правымі.

Для нас, рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў цяжкай прамысловасці, асабліва цяжка страта нашага камандарма, таго, хто пад непасрэдным кіраўніцтвам Сталіна стварыў першакласную цяжкую прамысловасць — базу пабудовы сацыялізма ў нашай краіне.

— Мы смуткуем аб страце нашага Серго. Лепшым помнікам Серго будзе яшчэ шчыльнейшая наша згуртаванасць вакол большэвіцкай партыі, вакол нашага любімага дарагога Сталіна — аднадушна заявілі рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя завода імя Кірава на мітынгу.

ШАМЕС, МАЦЮШ, САРОКІН, БАРСУКОВА.

ГОРАД У ЖАЛОБЕ

БАБРУЙСК. Не стала Серго. Смутная вестка з маланкавай хуткасцю абляцела ўсе прадпрыемствы Бабруйска. Усё заціхла. Горад ахоплен журбой. Над фасадамі дамоў нізка звісяюць жалобныя шцягі.

З раніцы па ўсіх прадпрыемствах, у навучальных і дзяржаўных установах адбыліся жалобныя мітынгі працоўных.

У прынятай на мітынгу рэзалюцыі рабочыя мэблевай фабрыкі імя Халтурына пішуць: «Мы будзем яшчэ больш пільны з ўсёй большэвіцкай непрымірымасцю будзем выкарчоўваць рэшткі троцкісцкага хвосця. Падсесіярым сваю прадукцыйнасць, будзем працаваць так, як вучыў і працаваў наш дарагі Серго».

Вечарам, у 5 гадзін на плошчу імя Фрунзе велізарнымі патокамі хлынулі калоны працоўных Бабруйска. Плошча перапоўнена. Каля 30 тысяч працоўных сабраліся на агульнагарадскі мітынг, каб ушанаваць памяць стойкага, непахіснага большэвіка, сына працоўнага народу і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва—Грыгорыя Канстанцінавіча Орджанікідзе.

Дрыжачым голасам сакратар РК КП(б)Б тав. Чэрнышоў выгаварвае з трыбуны словы:

— Не стала большэвіка-ленінца, вернага сына нашай партыі і савецкага народу, аднаго з арганізатараў ордэнаноснай БССР.

Аркестры выконваюць жалобныя маршы. Сэрца кожнага з прысутных агорнута болем і жалем аб той страце, якую панесла ў гэтыя дні краіна будуючагася сацыялізма.

На мітынгу выступалі прадстаўнікі вайсковых часцей Бабруйскага гарнізона. Яны расказваюць аб заслугах таварыша Орджанікідзе ў стварэнні моцнай Чырвонай Арміі. Яны выказваюць сваю гатоўнасць у любую мінуту стаць на абарону бацькаўшчыны.

— Клянемся партыі і тав. Сталіну,— заявіў на мітынгу ў сваім выступленні стаханавец лесакамбіната тав. Рубан,— што мы будзем працаваць таксама самааддана, як працаваў наш любімы Серго Орджанікідзе.

Стаханавец завода імя Сталіна тав. Каровін у сваім выступленні заявіў:

— Тая справа, за якую змагаўся тав. Орджанікідзе, будзе завершана намі.

Мітынг скончан. Удзельнікі яшчэ доўга не разыходзяцца, успамінаюць аб гераічных подвігах палкага большэвіка тав. Орджанікідзе.

ПАТАПЕЙКА.

СХІЛЯЕМ ГАЛОВЫ

Работнікі Ўпаўнаважанага Камісіі Савецкага Кантроля пры СНК СССР па Беларускай ССР з глыбокім смуткам і вострым болем даведаліся аб смерці найвялікшага дзеяча комуністычнай партыі і савецкай дзяржавы, непахіснага ленінца, вернага саратніка і бліжэйшага друга Сталіна, любімага сына нашай вялікай радзімы таварыша Орджанікідзе.

Ён памёр на баявым пасту, працуючы да пакладаючы рук да апошняй мінуты, і ўсё сваё палкае жыццё аддаў справе рабочага класа, вядучы нястомную бязлітасную барацьбу супроць усіх ворагаў партыі і працоўных.

Мы схіляем свае галовы перад прахам ніколі незабыўнага нашага роднага Серго і абавязваемся працаваць з такой-жа большэвіцкай упартасцю і працавітасцю, з такой-жа непрымірымасцю да ворагаў сацыялізма, як працаваў тав. Орджанікідзе.

Яшчэ больш згуртуем свае рады вакол партыі, нашага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна.

Калегіўны Ўпаўнаважанага КСК пры СНК СССР па БССР.

ПАМЯЦІ ГЕРАІЧНАГА БАРАЦЬБІТА ЛЕНІНСКАЙ ГВАРДЫІ

Не стала роднага Серго Орджанікідзе, выдатнага большэвіка, гераічнага барацьбіта старой ленінскай гвардыі, бліжэйшага саратніка і друга вялікага Сталіна. Ён прайшоў слаўны шлях баявых перамог. Ні ссылкі, ні Шлісельбург, ні труднасці баявых год грамадзянскай вайны не маглі зламаць яго несакрушальнай, большэвіцкай энергіі. Ён быў бязлітасны ў барацьбе з ворагамі партыі і сацыялістычнай радзімы — з праклятымі трацкістамі і іх правымі пасобнікамі. Ён быў вялікі ў сваіх клопатах аб чалавеку, у сваёй любві да народу. Ён у сваёй рабоце ўвасобіў сталінскі стыль кіраўніцтва і таму ён не ведаў паражэння.

Велізарная і непапаўнімая страта. Вялікая жалоба народу. Але ні ценю замяшання, ні ценю разгубленасці. Тысячы і дзесяткі тысяч выхаваных ім большэвікоў сацыялістычнай прамысловасці, натхнёныя яго ідэямі, давядуць яго справу да канца. Цясней згуртуем свае рады вакол партыі Леніна—Сталіна. Вечная слава Серго Орджанікідзе.

Агульны сход совецкіх пісьменнікаў БССР.

ГЕРАІЧНЫ БАРАЦЬБІТ ЗА КОМУНІЗМ

Акадэмія навук БССР разам з усім совецкім народам глыбока патрасена заўчаснай смерцю бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна, гераічнага барацьбіта за комунізм, палкага барацьбіта за большэвіцкае адзінства партыі, легендарнага героя грамадзянскай вайны, камандарма цяжкай прамысловасці, друга совецкай навукі, друга беларускага народу, незабыўнага таварыша Грыгорыя Канстанцінавіча Орджанікідзе.

Вучоныя Совецкай Беларусі, схіляючы галовы перад светлай памяцю ўшоўшага байца, яшчэ пясней згуртуюцца вакол вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна, вакол большэвіцкай партыі ў барацьбе за справу комунізма, якой аддаў жыццё таварыш Серго.

Прэзідыум Акадэміі навук БССР — Акадэмікі: СУРТА, КОЛАС, ВАЛЬФСОН, БУРСТЫН, АФАНАСЬЕЎ, ПАНКЕВІЧ, праф. КАЙГАРАДАЎ, БЛАДЫКА.

ЗАГАРТАВАНЫ БОЛЬШЭВІК

Памёр тав. Серго. Гэта вестка вострым болем адзываецца ў сэрцах і свядомасці мільёнаў людзей нашага велізарнага Совецкага Саюза.

Памёр той, хто поплеч, разам з В. І. Леніным і І. В. Сталіным прайшоў вялікі і цяжкі шлях ад падполля партыі да Кастрычніка, ад Кастрычніка, грамадзянскай вайны і пасля смерці Уладзіміра Ільіча, поруч з вялікім Сталіным, прывёў нашу краіну да дзён перамогшага сацыялізма, да дзён вялікай Сталінскай Канстытуцыі.

Асабліва балюча адчуваюць гэту страту для справы комунізма, для нашай партыі тыя, хто асабіста ведаў тав. Серго, непрымірымага барацьбіта за справу Леніна—Сталіна, загартаванага доўгімі гадамі падполля правадыра рабочага класа, прамога, рэзкага, без усякіх хістанняў і кампрамісаў большэвіка і адзыўлівага, душэўнага, высокакультурнага чалавека. Цвёрда кіруемая ім наша цяжкая прамысловасць стварыла фундамент для сацыялістычнай перабудовы усёй нашай гаспадаркі, з'явілася базай для ўзмацнення абароны нашай краіны.

Памёр на сваім пасту вялікі камандзір нашай цяжкай прамысловасці, але жыве ў свядомасці мільёнаў працоўных яго баявы кліч — «наперад да комунізма!».

І. РУДАКОЎ.
Нарком лясной прамысловасці БССР.

ТАЛЕНАВІТЫ АРГАНІЗАТАР ПЕРАМОГ НАШАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Вестка аб смерці тав. Орджанікідзе — бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна, аднаго з таленавітых арганізатараў перамог сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР—патрасае кожнага працоўнага. Асабліва цяжка асабіста ведаўшым гэтага выдатнага кіраўніка, непахіснага большэвіка і адзыўлівага таварыша.

Працуючы пад непасрэдным кіраўніцтвам тав. Орджанікідзе з 1930 г.—раней у ВСНГ БССР, а затым упаўнаважаным Наркамцяжпрома СССР пры СНК БССР, не не раз прыходзілася зварачацца да яго за вырашэннем раду складаных пытанняў работы прамысловасці БССР. І заўсёды, не гледзячы на надзвычай вялікую занятасць, ён знаходзіў час прыняць, выслухаць і станоўча вырашаць пытанні.

Прамысловасць БССР многім абавязана тав. Серго. Ён уклаў вялікую ўвагу энергазбраенню БССР — будаўніцтву і расшырэнню электрастанцый. Памятаю такі выпадак. Гэта было ў 1933 годзе. Сармазілася атрыманне абсталявання з Мікееўскага завода для другой Менскай дзяржаўнай электрастанцыі. Па даручэнню ЦК і СНК БССР я ездзіў па гэтаму пытанню да тав. Орджанікідзе. Ён прыняў, выслухаў і тут-жа даў распараджэнне выдаць абсталяванне: турбіну і катлы Менску.

Тав. Орджанікідзе аддаваў таксама вялікую ўвагу арганізацыі торфаздабычы і хімічнай прамысловасці, разгортванню металапрамысловасці ў БССР. Прычым ён лічыў асабліва важным спецыялізацыю заводаў, уняпрэнне варштата-і машынабудаўніцтва. Па яго заданню рад металазаводаў прыступілі да вырабу абсталявання для чорнай металургіі СССР. Гэта задание работнікі металапрамысловасці БССР выконвалі з гонарам, недаючы, што дырэктыва тав. Серго выпякае з гістарычнай прамовы дарагога правадыра народаў тав. Сталіна, сказанай у 1931 г. на першай нарадзе работнікаў сацыялістычнай прамысловасці. У рабоце гэтай нарады я таксама прымаў удзел. Гэта нарада была сапраўднай школай для кожнага гаспадарніка, у тым ліку і для мяне. Яна расшырыла мой кругазор, як работніка прамысловасці, дала правільны напрамак у далейшай рабоце.

Характэрна прывесці пару прыкладаў, якія сведчаць, якую ўвагу аддаваў тав. Орджанікідзе торфаздабычы ў БССР. Я прыехаў у Наркамцяжпром для вырашэння пытання аб абсталяванні для арганізацыі здабычы вялікага гідраторфу. Сяджу ў прыёмнай. Людзей, чакаючых прыёму, было многа. Я нават баяўся, што не змагу папасці да наркома. Хутка пасля прыёму аднаго таварыша Серго вышаў у прыёмную і пачаў дазвоньвацца, хто на якому пытанню прышоў. Калі я сказаў, што прыехаў наконт машын для арганізацыі здабычы вялікага гідраторфу, ён папрасіў зайсці да яго праз гадзіну. Дакладна ў вызначаны час Серго прыняў мяне. Ён вельмі зацікавіўся, як мы думаем гэту справу арганізаваць і тут-жа даў па тэлефону ўказанне Саюзторфу—забяспечыць Беларусь абсталяваннем для арганізацыі здабычы вялікага гідраторфу, прычым вызначыў паўны тэрмін, у які павінна быць выраблена абсталяванне. У рэзультаце — БССР своечасова атрымала машыны і разгарнула работы па здабычы вялікага гідраторфу.

Наколькі Серго аператыўна правяраў і цікавіўся ходам торфаздабычы ў Беларусі сведчыць такі факт. У 1933 годзе дырэктарам Асінторфа была атрымана яго асабістая тэлеграма. У ёй ён пісаў, прыкладна, наступае: «Праграма торфаздабычы на вашым заводзе не выконваецца. Сушка спазняецца. Гэта пагражае зрывам работы Белдорс. Прыміце меры да ліквідацыі прарыву». Пры гэтым Серго прасіў інфармаваць яго аб прынятых мерах.

Тав. Орджанікідзе непасрэдна даведваўся аб ходзе будаўніцтва гомельскага шклозавода, рабоце Гомсельмаша і інш.

Для сканчэння будаўніцтва крычаўскага цэментнага завода нехапала сродкаў. Стаяла пытанне аб кансервацыі завода. Але тав. Орджанікідзе, прыняўшы мяне, рассеяў усякія думкі аб кансервацыі. Ён неадкладна распарадзіўся перавесці нам 1.100 тыс. рублёў для сканчэння будаўніцтва завода.

Якія-б галіны прамысловасці БССР ні ўзяць, усюды відаць клапатлівая рука камандарма цяжкай прамысловасці, які, як таленавіты гаспадар, непасрэдна кіраваў ростам прамысловасці на ўсіх кутках неасяжнага Совецкага Саюза.

Нельга забыць яго таварыскасць, прастату ва ўзаемаадносінах. Памятаю такі выпадак. Іду па карыдоры ў Наркамаце цяжкай прамысловасці, ззаду хтосьці нагнаў мяне і, узяўшы за плячо, пытае: «Ну, як справы ў Беларусі?». Гэта быў Серго. Ён спяшаўся на пасяджэнне калегіі, аднак знайшоў магчымым затрымацца са мной. На пасяджэннях калегіі ён не раз жорстка крытыкаваў асобных работнікаў, але адначасова і натхняў іх, даваў указанні, вучыў як працаваць. Пасля яго крытыкі кожны загараўся жаданнем выправіць памылкі, працаваць так, як вучыць нарком.

І вось няма больш гэтага выдатнага большэвіка, таленавітага кіраўніка, адзыўлівага таварыша. Лепшым помнікам яму будзе — працаваць так, як не раз вучыў ён нас, мацаваць нашу індустрыяльную магутнасць, мацней згуртаваць вакол нашай партыі і вялікага Сталіна.

П. І. АМБРАЖУНАС.
Намеснік наркома комунальнай гаспадаркі БССР.

НАДЗВЫЧАЙНЫ XII УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД СОВЕТАЎ

ДАКЛАД СТАРШЫНІ РЭДАКЦЫЙНАЙ КАМІСІІ З'ЕЗДА таварыша ГАЛАДЗЕДА М. М.

Таварышы, Рэдакцыйная Камісія, якая была абрана З'ездам Советаў, працавала 18 лютага 1937 года і ўстанавіла канчатковы тэкст Канстытуцыі Беларускай ССР, які ўносіцца на канчатковае зацверджанне З'езда.

Рэдакцыйная Камісія ўнесла наступныя папраўкі ў тэкст Канстытуцыі:

У раздзеле II артыкул 14, у якім запісана, што Беларуская Совецкая Сацыялістычная Рэспубліка складаецца з акруг і раёнаў, Рэдакцыйная Камісія ў гэты артыкул ўнесла папраўку, каб раёны, якія ўваходзяць у склад акруг, таксама запісаць у Канстытуцыі. Таму ў рэдакцыі Рэдакцыйнай Камісіі З'езда гэты артыкул Канстытуцыі будзе чытацца так:

«Беларуская Совецкая Сацыялістычная Рэспубліка складаецца з акруг: Лепельскай у складзе раёнаў: Бягомльскага, Лепельскага, Ушацкага, Чашніцкага; Мазырскай у складзе раёнаў: Даманавіцкага, Ельскага, Жыткавіцкага, Капаткевіцкага, Лельчыцкага, Мазырскага, Нараўлянскага, Петрыкаўскага, Тураўскага; Полацкай у складзе раёнаў: Асвейскага, Ветрынскага, Дрысенскага, Полацкага, Расонскага; Слуцкай у складзе раёнаў: Грэскага, Копыльскага, Любаньскага, Слуцкага, Старобінскага, Чырвонаслабодскага; і з раёнаў: Аршанскага, Асіпавіцкага, Бабруйскага і г. д.» з пералічэннем усіх астатніх раёнаў.

Чым выкліканы гэтыя папраўкі Рэдакцыйнай Камісіі?

Яны выкліканы тым, каб пералічыць і запісаць у нашай Канстытуцыі ўсе раёны, у тым ліку і тыя, якія ўваходзяць у склад пералічаных акруг. Гэта па-першае.

Па-другое, гэтым самым канкрэтна абазначаецца размер акругі і з якіх раёнаў акруга складаецца і, па-трэцяе, што ў гэтых раёнах таксама ўстанаўляецца больш стабільнае становішча ў сэнсе адміністрацыйнага падзелу.

Увесь сэнс гэтага артыкула Канстытуцыі заключаецца ў тым, што раз запісваюцца раёны і акруті ў нашу Канстытуцыю, то тым самым устанаўляецца ўстойлівасць у адміністрацыйны падзел Рэспублікі, гэта значыць, будуць паменш краіць і перакройваць граніцы раёнаў, акруг і сельскіх советаў.

Вы памятаеце, што тав. Сталін у сваім дакладзе таксама гаварыў, што нам трэба і ў справе раёнавання мець устойлівасць, стабільнасць. Гэта неабходна для гаспадарчага і палітычнага развіцця кожнага раёна, акруті, сельсовета.

Гэта — першая папраўка Рэдакцыйнай Камісіі.

Другая папраўка ў пункце «ж» артыкула 19-га. Гэтым артыкулам Канстытуцыі вызначаецца, чым ведае Беларуская ССР у асобе яе вышэйшых органаў улады і органаў дзяржаўнага кіравання.

Гэты пункт гаворыць, што БССР разам з іншымі задачамі ведае складаннем і выкананнем бюджэтаў рэспублікі, акруг і раёнаў. Рэдакцыйная Камісія дадала пасля слова «раёнаў» і «гарадоў». Гэта значыць, што кіраванне складаннем і выкананнем бюджэтаў акруг і раёнаў таксама будзе распаўсюджвацца і на гарады. Патрэбнасць гэтай папраўкі зусім зразумелая. Таму я не буду прыводзіць матывіроўкі.

У раздзеле 5 артыкул 54 Рэдакцыйная Камісія дадала слова: «пасёлка». І ў канчатковай рэдакцыі гэты артыкул будзе чытацца так: «Советы дэпутатаў працоўных (акругі, горада, раёна, сяла, мястэчка, пасёлка) кіруюць культурна-палітычным і гаспадарчым будаўніцтвам на сваёй тэрыторыі, устанаўляюць мясцовы бюджэт, кіруюць дзейнасцю падпарадкаваных ім органаў кіраўніцтва, забяспечваюць ахову дзяржаўнага парадку, садзейнічаюць узмацненню абароназдольнасці краіны, забяспечваюць выкананне законаў і ахову правоў грамадзян».

Ёсць рэдакцыйная папраўка і артыкула 57. У папярэдняй рэдакцыі артыкула 57 было напісана: «Выканаўчымі і распарадчымі органамі сельскіх Советаў дэпутатаў працоўных (у сёлах, вёсках, пасёлках, мястэчках) у невялікіх паселішчах з'яўляюцца старшыня, яго намеснік і сакратар, якія абіраюцца імі».

Рэдакцыйная Камісія дала наступную рэдакцыю гэтага артыкула: «Выканаўчымі і распарадчымі органамі сельскіх Советаў дэпутатаў працоўных (у сёлах, вёсках, пасёлках, мястэчках) у невялікіх паселішчах з'яўляюцца старшыня, яго намеснік і сакратар, якія абіраюцца адпаведнымі Советамі дэпутатаў працоўных». Гэтым уласканалена рэдакцыя гэтага артыкула. Матывіроўка гэтай папраўкі таксама не патрабуецца.

У артыкуле 58 там, дзе пералічана: акругі, раёны, гарады, сяла, мястэчка, дададзена слова: «пасёлка».

У артыкул 66-ы ўнесена папраўка, каб у акругах ўтварыць дарожныя аддзелы выканаўчых камітэтаў, а таксама і сектары кадраў пры старшыні акруговага выканаўчага камітэта.

Такі-ж дадатак унесен Рэдакцыйнай Камісіяй пра ўтварэнне сектараў кадраў пры старшынях выканкомаў гарадскіх Советаў дэпутатаў працоўных. Гэта датычыцца артыкула 72-га.

Папраўкі аб ўтварэнні сектараў кадраў маюць вялікае значэнне, бо пэты Советы (акруговы, раённы, гарадскі) павінны значна сур'ёзней, чым гэта было да гэтага часу, паставіць справу выяўлення, арганізацыі і падрыхтоўкі кадраў, бо Совет — гэта масавая арганізацыя, аспоўная арганізацыя ўцягнення мас у дзяржаўнае кіраванне і ў справу сацыялістычнага будаўніцтва. І таму Советы і выканаўчыя камітэты павінны справу арганізацыі і падрыхтоўкі масавых кадраў паставіць значна лепш, чым гэта было ва многіх Советах да гэтага часу. Таму ўтварэнне сектараў кадраў мае вялікае значэнне.

Вось тыя папраўкі, якія ўнесла Рэдакцыйная Камісія З'езда.

Таварышы, такім чынам праект новай Канстытуцыі БССР шырока абгаворан усім беларускім народам перад З'ездам Советаў, таксама і на самім З'ездзе, ён ужо канчаткова адрэдагаваны і ўносіцца на канчатковае зацверджанне Надзвычайнага XII З'езда Советаў БССР.

Наша новая Канстытуцыя з пачатку і да канца прапітана сталінскім духам, яна складзена ў поўнай адпаведнасці са Сталінскай Канстытуцыяй Саюза ССР.

Прычым я дакладваю З'езду, што ў складанні праекта новай Канстытуцыі БССР прымаў асабісты ўдзел тав. Сталін. **(Бурныя апладысменты).**

Тав. Сталін рэдагаваў праект нашай Канстытуцыі і адобрыў яго. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Такім чынам беларускі народ з поўным правам называе сваю Канстытуцыю Беларускай ССР таксама Сталінскай Канстытуцыяй. (Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў доўгую авацыю. Увесь З'езд ўстае і наладжвае бурную авацыю).

Няма ніякіх сумненняў, што XII Надзвычайны З'езд Советаў БССР аднадушна зацверджыць гэтую Сталінскую Канстытуцыю БССР — Канстытуцыю перамогшага сацыялізма. **(Бурныя, доўгія апладысменты, усе ўстаюць, воклічы з месц: «Няхай жыве тав. Сталін!», «Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя БССР!». Бурныя апладысменты, доўгая авацыя).**

СТАЛІНСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ БССР ЗАЦВЕРДЖАНА

(З залы з'езда)

Сталінская Канстытуцыя Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспублікі зацверджана Надзвычайным XII З'ездам Советаў.

Зацверджана аднагалосна.

Зацверджана аднадушна.

За яе галасавала 744 лепшых сыны і дачкі Совецкай Беларусі — знатнейшыя людзі рэспублікі, абраннікі народу. Ім адроджаны вялікай пролетарскай сацыялістычнай рэволюцыяй беларускі народ даверыў утварыць гэты надзвычайны гістарычны акт, і яны выканалі яго волю. Яны аднадушна зацвердзілі Канстытуцыю — асноўны закон шчаслівага, радаснага жыцця беларускага народу.

Галасуючы за Канстытуцыю, кожны дэлегат перажываў найшчаслівейшыя мінуты свайго жыцця. У Канстытуцыі ўвасоблена сіла і магутнасць Совецкай Беларусі — сацыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян. Як адна з найпрыгажэйшых зорак зазяе Беларусь у вялікім сузор'і нацыянальнасцей у створанай Леніным і Сталіным на базе сацыялізма шматнацыянальнай дзяржаве.

Аб грандыёзных перамогах БССР сведчылі лічбы, прыведзеныя ў дакладзе Мандатнай Камісіі. За час, прайшоўшы ад VIII Усебеларускага З'езда Советаў у 1927 годзе, які зацвердзіў дзейнічаўшую да гэтага часу Канстытуцыю БССР, насельніцтва Беларусі вырасла на поўмільёна чалавек, асабліва вырасла насельніцтва гарадоў. На гэтым З'ездзе прысутнічаюць дэлегаты ад буйнейшых прадпрыемстваў, пабудаваных у перыяд паміж VIII—XII з'ездамі. Беларускі народ ганарыцца такімі гігантамі індустрыі, як аршанская Белдрэс, магілёўская шаўковая фабрыка, магілёўскі аўтарамонтны завод, гомельскі шклозавод імя Сталіна, «Гомсельмаш» імя Кагановіча, бабруйскі і гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты і дзесяткі іншых.

Прапоўныя Беларусі ніколі не забудуць, што сваю дзяржаўнасць, сваё шчаслівае жыццё яны набылі пад непасрэдным кіраўніцтвам комуністычнай партыі Леніна—Сталіна, што арганізатарам БССР і КП(б)Б з'яўляецца таварыш Сталін. І, галасуючы за кожны артыкул Канстытуцыі, дэлегаты не раз узнімаліся з сваіх месц і бурна апладыравалі вялікаму тварцу новай Канстытуцыі — роднаму Сталіну.

Громам апладысментаў дэлегаты рэагавалі на заяву тав. М. М. Галадзеда, што Канстытуцыю БССР рэдагаваў і адобрыў вялікі Сталін і таму яна можа быць названа Сталінскай. З усіх куткоў залы раздаліся воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!» і шматгалосае «Ура!» доўга патрасала своды вялікай залы.

Артыкул за артыкулам зачытваецца прадстаўлены Рэдакцыйнай Камісіяй на зацверджанне З'езда праект Канстытуцыі. Кожны артыкул галасуецца паасобку. Тав. Чарвякоў чытае сто першы артыкул:

«У адпаведнасці з інтарэсамі працоўных і ў мэтах развіцця арганізацыйнай самадзейнасці і палітычнай актыўнасці народных мас, грамадзянам БССР забяспечваецца права аб'яднання ў грамадскія арганізацыі: прафесіянальныя саюзы, кааператыўныя аб'яднанні, арганізацыі моладзі, спартыўныя і абаронныя арганізацыі, культурныя, тэхнічныя і навуковыя таварыствы, а найбольш актыўныя і свядомыя грамадзяне з ладу рабочага класа і іншых слаёў працоўных яднаюцца ва Усесаюзную комуністычную партыю (большэвікоў), якая з'яўляецца перадавым атрадам працоўных у іх барацьбе за ўмацаванне і развіццё сацыялістычнага ладу і якая з'яўляецца кіруючым ядром усіх арганізацый працоўных як грамадскіх, так і дзяржаўных».

Апошнія словы заглушае гром апладысментаў. З'езд устае. Авацыя нарастае, як шквал, як навальніца. «Ура комуністычнай партыі!», «Ура партыі Леніна—Сталіна!» — нясецца з усіх канцоў залы. Доўга не змаўкаюць апладысменты, часам яны пачынаюць спіхаць для таго, каб праз секунду загрымець з новай, яшчэ большай сілай. Радасцю ззяюць твары дэлегатаў — гэта радасць народу за свой авангард, за сваю родную адну і адзіную комуністычную партыю, пад чыімі пераможнымі сцягамі ён на барыкадах змагаўся з царызмам, утварыў тры рэволюцыі, знішчыў капіталістычны лад — лад рабства і бяспраўя, разграміў ворага на франтах грамадзянскай вайны, пад чыімі сцягамі ён пабудаваў бясклasавае сацыялістычнае грамадства і ўпэўнена сямімільнымі крокамі ідзе да ззяючых вяршынь комунізма.

Бурнымі апладысментамі дэлегаты суправаджаюць чытанне 107 і 108 артыкулаў, у якіх запісана аб абароне бацькаўшчыны. У гэтых воплесках гучэла гатоўнасць беларускага народу грудзьмі абараняць сваю цудоўную, квітнеючую пышным цветам радзіму.

Закончылася паартыкульнае галасаванне. Роўна ў 15 гадзін 35 мінут тав. Чарвякоў галасуе Канстытуцыю ў цэлым. Лес рук на хвіліну ўзняўся ўверх для таго, каб адразу апусціцца і бурна, доўга апладыраваць.

Сталінская Канстытуцыя — асноўны закон шчаслівага жыцця беларускага народу — зацверджана аднагалосна, аднадушна.

У зале раздаюцца ўрачыстыя гукі пераможнага пролетарскага гімна. Магутныя гукі вырываюцца за сцены залы. Яны клічуць на новую барацьбу за поўную перамогу комунізма.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

АДКРЫЦЦЕ 4-й СЕСІІ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР XI СКЛІКАННЯ АДБУДЗЕЦЦА 20 ЛЮТАГА г. г. У 11 ГАДЗІН РАНІЦЫ У ЗАЛЕ З'ЕЗДАЎ ДОМА УРАДА.

ПРЫСУТНІЧАННЕ УСІХ ЧЛЕНАЎ ЦВК БССР, СТАРШЫНЬ АВК, РВК і ГОРСОВЕТАЎ АБАВЯЗКОВА.

САКРАТАР ЦВК БССР **М. ЛЯУКОЎ.**

***

ПАСЕДЖАННЕ ПАРТЫЙНАЙ ГРУПЫ ЦВК БССР АДБУДЗЕЦЦА У 10½ ГАДЗІН РАНІЦЫ У ЗАЛЕ ПАСЕДЖАННЯЎ ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР.

АД КАМІСІІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПАХАВАННЯ ЧЛЕНА ПАЛІТБЮРО ЦК ВКП(б), ЧЛЕНА ЦВК САЮЗА ССР, НАРОДНАГА КАМІСАРА ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ тав. ОРДЖАНІКІДЗЕ Г. К.

Доступ у Калонную залу Дома саюзаў для развітання з нябожчыкам тав. **Орджанікідзе** Г. К. адкрыт да 24-х гадзін 20 лютага.

Крэмацыя цела тав. **Орджанікідзе** Г. К. адбудзецца ў ноч на 21 лютага.

Урна з прахам тав. **Орджанікідзе** Г. К. будзе ўстаноўлена там-жа, у Калоннай зале Дома саюзаў і доступ у Калонную залу будзе адкрыт з 6 гадзін раніцы да 14 гадзін 21 лютага. У 14 гадзін доступ да урны будзе спынен.

Пахаванне тав. **Орджанікідзе** Г. К. адбудзецца на Краснай плошчы 21 лютага ў 15 гадзін. Вынас урны з Дома саюзаў ў 14 гадзін 30 мінут.

Па прыбыцці урны з прахам тав. **Орджанікідзе** Г. К. на Красную плошчу ля маўзалея В. І. Леніна адбудзецца жалобны мітынг.

(БЕЛТА).

АД ЦК ВЛКСМ

ЦК ВЛКСМ прыносіць сваё глыбокае спачуванне ЦК ВКП(б) па повалу заўчаснай смерці выдатнага дзеяча нашай рэволюцыі, палкага большэвіка-ленінца, члена Палітбюро ЦК ВКП(б), Народнага Камісара Цяжкай прамысловасці СССР таварыша **Грыгорыя Канстанцінавіча Орджанікідзе.**

ЦК ВЛКСМ.

НАДЗВЫЧАЙНЫ XII УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД СОВЕТАЎ

ПАСЯДЖЭННЕ РЭДАКЦЫЙНАЙ КАМІСІІ

Роўна ў назначаны час у адну з залаў Дома ўрада сталі збірацца члены Рэдакцыйнай камісіі Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Саветаў, якой З'езд даручыў устанавіць канчатковы тэкст Канстытуцыі БССР.

Члены камісіі — гэта лепшыя з лепшых людзей БССР, краса і гонар ордэнаноснай рэспублікі. Амаль у паловы членаў Рэдакцыйнай камісіі на грудзях пабліскваюць ордэны Совецкага Саюза. Тут вы можаце ўбачыць людзей розных прафесій і спецыяльнасцей з дружнай сям'і беларускага народу. Радам з героем грамадзянскай вайны, узнагароджаным трыма ордэнамі Чырвонага сцяга,—камдывам тав. Гарачовым сядзіць маладая чыгуначніца-ордэнаноска Вілетнікава, стаханавец Гладышаў, прафэсар Марзон, старшыня калгаса Бейнэ. Тут засядаюць абраннікі народу — рабочыя, калгаснікі, камандзіры Чырвонай Арміі, паэты, наркомы,—ім беларускі народ даверыў канчаткова адрэдагаваць свой асноўны закон шчаслівага жыцця — Канстытуцыю БССР.

— За час усенароднага абмеркавання праекта Канстытуцыі БССР было ўнесена 212 паправак і дапаўненняў, — адкрыўшы пасяджэнне Рэдакцыйнай камісіі, кажа старшыня Канстытуцыйнай камісіі ЦВК БССР старшыня СНК БССР М. М. Галадзед.

— Нам прадстаіць, улічваючы рэзультаты ўсенароднага абмеркавання і выступленняў дэлегатаў З'езда, устанавіць канчатковы тэкст Канстытуцыі БССР і прадставіць яго на зацвярджэнне З'езда — працягвае тав. Галадзед.

Члены Рэдакцыйнай камісіі дасталі чырвоныя кніжкі, у якіх надрукован праект Канстытуцыі БССР і падрыхтаваліся да работы. Тав. Галадзед чытае першы артыкул першага раздзела праекта Канстытуцыі:

«Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка ёсць соцыялістычная дзяржава рабочых і сялян».

Прачытаўшы, тав. Галадзед пытае:

— Папраўкі або дадаткі ёсць?

У адказ на яго запытанне раздаецца вясёлы і законны смех. Для кожнага з прысутных, як і ўсім працоўным БССР, ясна, што Совецкая Беларусь ёсць іменна соцыялістычная дзяржава рабочых і сялян, і як галоўнае заваяванне соцыялістычнай рэволюцыі запісана ў праект Канстытуцыі БССР. Тав. Галадзед чытае далей:

«Артыкул 3. Уся ўлада ў БССР належыць працоўным горада і вёскі ў асобе саветаў дэпутатаў працоўных».

Члены Рэдакцыйнай камісіі напружана, з пачуццём вялікай адказнасці перад усім беларускім народам прадумваюць кожны артыкул і словы тэкста Канстытуцыі. Абсалютная большасць раздзелаў і артыкулаў Канстытуцыі не выклікае ніякіх сумненняў — напісана чотка і ясна, запісана тое, што заваявана беларускім народам пад кіраўніцтвам вялікай комуністычнай партыі і правадыра народаў таварыша Сталіна; праект Канстытуцыі БССР складзен на аснове Сталінскай Канстытуцыі Саюза ССР, знаходзіцца з ёю ў поўнай адпаведнасці.

Аднак, знайшлося не мала пунктаў, якія выклікалі гарачыя спрэчкі ў камісіі. Першая папраўка прымаецца да 14 артыкула. У праекце памянёны толькі назвы акруг, якія ўваходзяць у склад Беларускай ССР, і не пералічаны раёны, якія ўваходзяць у склад гэтых акруг. Камісія рашае ўнесці ў канчатковы тэкст Канстытуцыі назвы гэтых раёнаў.

Камісія доўга спыняецца на ўстанаўленні яснай фармулёўкі артыкула 57, які быў граматычна няправільна сфармуляваны. Пасля ўсебаковага разгляду была ўстаноўлена дакладная, не выклікаючая ніякіх сумненняў фармулёўка.

У 4 гадзіны дня камісія закончвае сваю работу, каб прадставіць З'езду канчатковы тэкст Канстытуцыі. Камісія даклад аб сваёй рабоце даручае зрабіць старшыні Канстытуцыйнай камісіі ЦВК БССР, старшыні СНК БССР тав. М. М. Галадзеду.

18 лютага.



Агульны выгляд залі пасяджэнняў Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Саветаў.

Канцэрт мастацкай самадзейнасці для дэлегатаў З'езда

16 лютага ў памяшканні Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра для дэлегатаў Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Саветаў быў наладжан вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці з удзелам лепшых рабочых і калгасных самадзейных калектываў 11 раёнаў БССР.

Абшырная праграма канцэрта была цікавай і рознастайнай.

З асаблівым заслужаным поспехам выступіў калектыў масталкай самадзейнасці Хойніцкай МТС. Калектыў выканаў прывітальны марш, напісаны і перакладзены на музыку самімі выканаўцамі, калгасныя частушкі і народны танец «Лявоніху». Выключнае выкананне, поўнае дынамічнасці, жывасці, шчырай весялосці, сустрэла гарачы прыём усіх прысутных на вечары.

Ніжэй мы друкуем тэкст прывітальнага марша.

ПРЫВІТАЛЬНЫ МАРШ

Надзвычайнаму XII З'езду Саветаў БССР

Прышлі з адзінаю мы мэтай —
Прывет гарачы перадаць,
Наш Надзвычайны З'езд Саветаў
Са шчырай радасцю вітаць.

Правадыра мы ўсе вітаем
І слаўны сталінскі закон.
Усіх нас у жыцці шчаслівым
Да творчай працы кліча ён.

Натхнёныя вялікай мэтай
Пяройдзем праз любы парог,
З вялікім сталінскім законам
Дабіцемся новых перамог.

Мы людзі сталінскай эпохі,
Вялікі Сталін нас расціць.
Усюды шчасце, усюды радасць,
Дзе імя Сталіна грыміць.

Не менш, чым восем мільярдаў
Пудоў зярна за год дадзім.
Такі наказ даў родны Сталін,
І гэта помніць трэба ўсім.

Стаім на варце мірнай працы
Сталёвай моцнаю сцяной.
Хай клікне маршал Варашылаў,
Мы смела рынемся ў бой.

Жыць стала лепш і весялей,
Работа спорыцца хутчэй.
Табе падзяка, родны Сталін,
За радасць гэтых светлых дней.

У дружбе брацкай мы спляцімся
Шчыльней вакол ВКП(б)
Вядзі-ж далей нас, родны Сталін,
К комуністычнай грамадзе.

Ваенна-фашысцкі мяцеж у Іспаніі

Наступленне рэспубліканскіх войск у раёне Харама

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 18 лютага. (БЕЛТА). Як паведамляе агэнцтва Гавас, наступленне рэспубліканскіх войск у сектары ракі Харамы (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) пачалося 17 лютага ў 4 гадзіны раніцы інтэнсіўным артылерыйскім абстрэлам пазіцый мяцежнікаў. З гэтым абстрэлам былі камбінаваны дзеянні 22 урадавых бамбардыроўшчыкаў пры падтрыманні эскадрыллі знішчальнікаў. Праз гадзіну пачалося наступленне ўрадавай пяхоты пры падтрыманні танкаў і браневікоў.

Урадавым часцям удалося ўварвацца ў непрыяцельскія пазіцыі пасля двухгадзіннага яраснага бою. Яшчэ праз гадзіну непрыяцель пачаў адступаць з левага фланга. На гэтай стадыі бою адыгралі буйную ролю ўрадавыя танкі, якія сістэматычна знішчалі кулямётныя гнёзды мяцежнікаў. З 8 гадзін раніцы другая ўрадавая калона павяла наступленне супроць непрыяцельскіх пазіцый у Мараньоса.

К вечару 17 лютага рэспубліканскія войскі прасунуліся наперад на 3 клм. на левым флангу мяцежнікаў, ля вёскі Сан-Мартын дэ ля Вега. Вёска Пералес Тахунья, якая знаходзілася пад пагрозай захвату мяцежнікамі, вызвалена.

Агенцтва Гавас адзначае, што бой у сектары ракі Харамы быў адным з самых упартых баёў, якія адбываюцца пад Мадрыдам. Урадавым танкам і браневікам прышлося доўга пракладваць дарогу для пяхоты праз непрыяцельскія дротавыя загароды, тым часам, як артылерыя сістэматычна бамбардыравала ўсе шляхі падыходу непрыяцельскіх рэзерваў. Урадавая авіяцыя прымала актыўны ўдзел у баях. Ноччу мяцежнікі пачалі адступленне пасля таго, як яны безрэзультатна пусцілі ў ход рэзервы з другой і трэцяй лініі ўмацаванняў.

ПАВЕДАМЛЕННЕ КАМІТЭТА АБАРОНЫ

МАДРЫД (сталіца Іспаніі), 18 лютага. (БЕЛТА). Апублікаваная ўчора ўвечары зводка камітэта абароны Мадрыда аб становішчы на мадрыдскім фронце гаворыць: У сектары Эскарыял (на паўночны ўсход ад Мадрыда) фашысты ноччу атакавалі нашы пазіцыі каля Сан Беніто, але былі адагнаны і панеслі страты. Непрыяцель безрэзультатна атакаваў Універсітэцкі гарадок і Заходні парк.

У сектары ракі Харамы нашы войскі, прадпрыняўшыя камбінаванае наступленне на фланг непрыяцельскіх войск, прасунуліся наперад і значна палепшылі свае пазіцыі. Непрыяцель, падпягнуўшы рэзервы, перайшоў у контратаку, але быў адкінут і панёс вялікія страты. Нашы войскі замацавалі занятыя пазіцыі. Матэрыялы і зброя, пакінутыя непрыяцелем, папалі ў нашы рукі.

* * *

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 18 лютага. (БЕЛТА). Як перадае агэнцтва Гавас з Мадрыда, згодна даных вярхоўнага камандавання рэспубліканскай арміі, рэспубліканскія часці на фронце Харамы прасунуліся наперад на 5 кілометраў. У паведамленні камітэта абароны Мадрыда ўказваецца, што мяцежнікі адступілі ў вялікім беспарадку, пакінуўшы на полі бою ў вялікай колькасці ўзбраенне і боепрыпасы.

* * *

ПАРЫЖ, 18 лютага. (БЕЛТА). Агенцтва Эспань паведамляе, што на працягу апошніх некалькіх дзён мяцежнікі страцілі пад Мадрыдам 9 тыс. забітымі. Знішчана 15 самалётаў мяцежнікаў.

Бамбардыроўка Мадрыда

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 18 лютага. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што ў поўнач мяцежнікі бамбардыравалі Мадрыд з 15 самалётаў. Бамбардыроўцы падвергліся галоўным чынам, раёны, якія прылягаюць да цэнтра горада. Згодна папярэдніх даных, забіта 11 і ранена 60 чалавек. Адна бомба ўпала на будынак бельгійскага пасольства, але не ўзарвалася.

У ЛОНДАНСКІМ КАМІТЭЦЕ ПА НЕЎМЯШАННЮ

ТАКТЫКА САБАТАЖУ ПРАДАЎЖАЕЦЦА

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 18 лютага. (БЕЛТА). Як паведамлялася, пасяджэнне падкамісіі пры старшыні камітэта па неўмяшанню ў справы Іспаніі 16 лютага было склікана для разгляду пярэчанняў Партугаліі супроць прыняцця плана кантролю. Але паколькі прадстаўнік Партугаліі заявіў, што ў яго ўсё яшчэ няма інструкцый ад свайго ўрада, то ў парадак дня пасяджэння было пастаўлена пытанне аб далейшай праграме работ падкамісіі.

Як заявіў на пасяджэнні прадстаўнік Францыі Корбен, французкі ўрад месяц таму назад прыняў закон аб забароне пасылкі добраахвотнікаў у Іспанію і аб кантролі. Для ўвядзення ў дзеянне гэта га закона французкі ўрад павінен мець упэўненасць у тым, што адначасова такія-ж меры прымаюцца і іншымі краінамі. Прысутнічаўшы на пасяджэнні падкамісіі прадстаўнік Партугаліі Мантэйра, аднак, не толькі не мог абяцаць ніякага кантролю, але ён пават не мог сказаць, калі паступіць адказ партугальскага ўрада. Прадстаўнік Германіі Рыбентроп і Італіі Грандзі падтрымлівалі Мантэйро. У рэзультаце жорсткай дыскусіі, у якой прынялі актыўны ўдзел таксама прадстаўнікі Англіі, Францыі і СССР, не было дасягнута ніякага пагаднення. Пасяджэнне закончылася, не прыняўшы якога-небудзь пэўнага рашэння.

Збіенне совецкага марака ў Польшчы

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 18 лютага. (БЕЛТА). У польскім парту Гдыня (недалёка ад г. Данцыга) меў месца бясспрыкладны факт здзекаў польскіх паліцэйскіх над совецкім мараком і збіення яго.

11 лютага, у 10 гадзін вечара, у Гдыні на вуліцы быў схвачан двума паліцэйскімі і падвергнут катаванням марак совецкага парахода «Леонид Красин»—Неўзораў. Неўзораў купляў у краме напіросы. У гэты момант да яго падбеглі два паліцэйскія і насільна запягнулі яго ў бліжэйшы пад'езд, дзе загадалі яму хрысціцца. Калі Неўзораў адмовіўся гэта зрабіць, паліцэйскія прыняліся выкручваць яму рукі, біць па твару і пагражаць расстрэлам. Затым, раздзеўшы і безрэзультатна абыскаўшы яго, паліцэйскія выштурхнулі Неўзорава на вуліцу і ўдаліліся. Збіенне адбывалася на вачах двух работніц парахода «Леонид Красин» Нікіцінай і Куроцевай.

Па поваду гэтых нечуваных здзекаў польскай паліцыі над совецкім мараком наўпрадства СССР у Польшчы дасласла польскаму міністэрству замежных спраў ноту пратэсту. У ноце ўказваецца, што ўжо не ўпершыню каманды састаў і экіпаж прыбываючых у Гдыню совецкіх параходаў падвяргаюцца неабгрунтаваным арыштам і здзекам з боку прадстаўнікоў мясцовых улад і што гэтыя праследванні, несумненна, знаходзяцца ў сувязі з той варожай кампаніяй, якая вядзецца часткай польскага друку супроць совецкіх маракоў.

Па стапах германскага фашызма

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 17 лютага. (БЕЛТА). Учора на пленарным пасяджэнні польскага сейма разглядаўся праект бюджэта міністэрства юстыцыі. Дакладчык, дэпутат сейма Сіода канстатаваў «устрашаючы рост злачынасці за мінулы год у Польшчы і выказаўся за правядзенне «стэрылізацыі» (абязплоджвання) злачынцаў. Сіода заявіў: «Як вучыць вопыт іншых дзяржаў, неабходна змена карнай палітыкі. Прыхільнікаў гуманных мер пакарання ўсё больш перамагаюць прыхільнікі ўзмацнення карнага рэжыму, прыхільнікі ўвядзення новых сродкаў пакарання і прымянення новых прымусовых мер, як стэрылізацыя закаранелых злачынцаў. Неабходна неадкладна прыступіць да адпаведных падрыхтоўчых мер».

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС ПАСТУПІЦЬ
У АДДЗЕЛ ПАДПІСКІ КОГІЗ'а

ДАКЛАД т. СТАЛІНА І. В.,

запісаны на 21 двухбаковай

ГРАМАФОННАЙ ПЛАСЦІНЦЫ

(У ПРЫГОЖЫМ АЛЬБОМЕ)

Партгабінеты,
клубы,
заводы,
фабрыкі,
ВНУ,
школы,
бібліятэкі,
стаханаўцы,
калгасы, соўгасы

АРГАНІЗУЙЦЕ КАЛЕКТЫЎНАЕ СЛУХАННЕ ГІСТАРЫЧНАГА ДАКУМЕНТА — ДАКЛАДА тав. СТАЛІНА на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Саветаў, запісаны на ГРАМАФОННЫХ ПЛАСЦІНКАХ.

Набывайце гістарычны даклад тав. СТАЛІНА І. В.

АЛЬБОМ З ГРАМАФОННЫМІ ПЛАСЦІНКАМІ можна набыць толькі шляхам здачы ПАПЯРЭДНЯЙ ПАДПІСКІ.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ЎСІМІ АДДЗЯЛЕННЯМІ, МАГАЗІНАМІ І ЎПАЎНАВАЖАНЫМІ Бел. аддз. КОГІЗ'а, а таксама АДДЗЕЛАМ ПАДПІСКІ КОГІЗ'а — гор. Менск, Совецкая, 73.

У гарадах і вёсках, дзе няма аддзялення КОГІЗ'а, заяўку разам з задаткам — 50 руб. накіроўвайце ў Менск, Совецкая, 73, аддзелу падпіскі КОГІЗ'а.

ЦАНА АЛЬБОМА З ПЛАСЦІНКАМІ — 75 РУБ.

Пры падпісцы ўносіцца задатак — 50 руб.

СВОЕЧАСОВА ЗДАНАЯ ПАДПІСКА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ АКУРАТНАЕ АТРЫМАННЕ АЛЬБОМА.
ПАДПІСКА АДКРЫТА З 15 ЛЮТАГА г. г.

З 1 ВЕРАСНЯ 1937 г.

УСЕ АБЛІГАЦЫІ РАНЕЙШЫХ ПАЗЫК,

НЕ АБМЕНЕНЫЯ НА АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск чацвертага года), ТРАЦЯЦЬ СВАЮ МОЦ І АБМЕНУ НЕ ПАДЛЯГАЮЦЬ.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДНЫХ КАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

ДА ВЕДАМА ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ ЗАХОЎВАЮЦЬ СВАЕ АБЛІГАЦЫІ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАЗЫК У АШЧАДНЫХ КАСАХ

У СУВЯЗІ З КАНВЕРСІЯЙ РАНЕЙШЫХ МАСАВЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ УНУТРАНЫХ ПАЗЫК СССР

УСЕ АБЛІГАЦЫІ:

3-й ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ, ПАЗЫКІ «ПЯЦІГОДКА Ў ЧАТЫРЫ ГАДЫ», ПАЗЫКІ 3-га РАШАЮЧАГА ГОДА ПЯЦІГОДКІ», ПАЗЫКІ «4-га ЗАВЯРШАЮЧАГА ГОДА ПЯЦІГОДКІ», ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (ВЫПУСКУ ПЕРШАГА, ДРУГОГА І ТРЭЦЯГА ГОДА), У ТЫМ ЛІКУ І ЗНАХОДЗЯЧЫЯСЯ Ў АШЧАДКАСАХ НА ХАВАННІ,

АБМЕНЬВАЮЦЦА НА АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

(ВЫПУСК ЧАЦВЕРТАГА ГОДА).

Аблігацыі, якія знаходзяцца на хаванні ў ашчадкасах, абменьваюцца на аблігацыі Пазыкі другой пяцігодкі (выпуск чацвертага года) пры асабістай яўцы іх уласніка або па яго пісьмовай заяве, высланай у ашчадкасу (заказным пісьмом) разам з ЗАХАВАЎЧА-СЭЎДНЫМ ПАСВЕДЧАННЕМ. У заяве неабходна ўказаць на якія аблігацыі новай Пазыкі другой пяцігодкі (выпуск чацвертага года) павінны быць абменены аблігацыі ранейшых пазык і ці належыць перасласць аблігацыі новай пазыкі іх уласніку, або пакінуць на далейшае захаванне ў ашчаднай касе.

Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б

АДКРЫТА ПАДПІСКА на ПОЎНЫ ЗБОР ТВОРАЎ В. І. ЛЕНІНА на белмове

(ПЕРАКЛАД З III РУСКАГА ВЫДАННЯ).

ПОЎНЫ ЗБОР ТВОРАЎ (УСЕ 30 ТАМОЎ) БУДЗЕ ВЫПУШЧАН НА ПРАЦЯГУ 1937—1938 гг.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

Поўны камплект, г. зн. 30 тамоў, каштуе 99 рублёў.

Індывідуальны падпісчык пры падпісцы ўносіць аванс—7 руб. 50 кап., а арганізацыі — 15 руб. за кожны выпісваемы камплект.

У лік аванса індывідуальным падпісчыкам высылаюцца бясплатна апошнія 2 тамы, а арганізацыям апошнія 4 тамы.

Усе тамы твораў Леніна высылаюцца падпісчыкам наложаным плацяжом.

Каштоўнасць усіх паштовых выдаткаў па ўпакоўцы і перасылцы адносіцца за кошт падпісчыка па сабекошту.

Грошы перасылаюцца ў адрас Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б—Менск, Дом друку.

ПАДПІСКУ ПРЫМАЕ:

Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б: Менск, Дом друку. Тэлефоны: 22-719, 21-506.

Пры выпісцы неабходна ўказаць свой дакладны адрас (горад, раён, сельсавет і т. д.), прозвішча і ініцыялы.

БЕЛПАРТВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
КАПІТАНСКАЯ ДАЧКА
(па Пушкіну)

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
ЗАКАТ

«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
«ПРОЛЕТАРЫЙ»
Гукавы фільм

Даклад т. Сталіна І. В.

АБ ПРАЕКЦЕ КАНСТЫТУЦЫІ САЮЗА ССР НА НАДЗВЫЧАЙНЫМ VIII УСЕСАЮЗНЫМ З'ЕЗДЗЕ СОВЕТАЎ
25 лістапада 1936 г.

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ЗБОРНАЯ УЛЬТЫ—
ІЛІКАЦЫЙНАЯ ПРАГРАМА

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
ПАЭТ І ЦАР

Гукавы кінотэатр «Спартак»
«НОВЫЕ ВРЕМЕНА»

Беларускі інстытут удасканалення ўрачоў

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ўрачоў і райздраваў аб арганізацыі наступных КУРСАЎ

па ўдасканаленню і спецыялізацыі:

1. 3-месячныя курсы (удасканаленне і спецыялізацыя) па ХІРУРГІІ ў г. Менску. Пачатак заняткаў 5 сакавіка.
2. 3-месячныя курсы (спецыялізацыя) па ВОЧНЫХ ХВАРОБАХ у г. Гомелі пры Беларускім офтальмалагічным інстытуце (дырэктар праф. БРУК). Пачатак заняткаў 1 красавіка.

Урачы раёнаў, якія маюць права на камандыроўку (3-гадовы перыферыйны стаж) і жадаюць спецыялізавацца і ўдасканальвацца па вышэйуказаных дысцыплінах, павінны прысылаць праз райздравы заявы аб залічэнні іх на гэтыя курсы.

Заявы ў інстытут павінны паступіць: па хірургічнаму цыклу — не пазней 25 лютага, а па вочнаму цыклу — не пазней 10 сакавіка.

Урачы забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй, а таксама за імі поўнасцю захоўваецца зарплата.

Дырэктар Бел. інстытута удасканалення ўрачоў дацэнт ДАБРУСКІН.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ІНСТЫТУТ

АБВЯШЧАЕ КОНКУРС

на заняцце пасады загадчыка кафедры аператыўнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі.

Тэрмін конкурса — 10 сакавіка 1937 г.

Заявы з прыкладаннем кароткага жыццяпісу і прац накіроўваць па адрасу: Менск, медыцынскі інстытут.

Дырэктар інстытута праф. МАНАХАЎ.

ГОМЕЛЬСКАМУ ЗООТЭХНІКУМУ

патрэбен

на пастаянную работу ВЫКЛАДЧЫК РУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ.

ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: г. Гомель, соўгас Брынёў, зоатэхнікум.

ПАТРЭБНЫ

на пастаянную работу: ДРУКАРЫ-«АМЕРЫКАНШЧЫКІ», Зварачацца: Совецкая, 63, 2-гі паверх, з 12 да 1 г. дня.

Адміністрацыя, мясцком і калектыў работнікаў Кіраўніцтва гідраметслужбы БССР выказваюць спачуванне супрацоўніцы Кіраўніцтва тав. ІВІЦКАЙ Н. А. з прычыны смерці ЯЕ МУЖА

Наркамхарчпром СССР «ГАЛОЎТАБАК»

З 15 лютага УНОУ АДКРЫТ

УЗОРНЫ МАГАЗІН ГАЛОЎТАБАКА

г. Менск, Ленінская, 16.

У магазіне ёсць у вялікім выбары ТАБАЧНА-МАХОРАЧНЫЯ ВЫРАБЫ І ТАБАЧНАЯ ГАЛАНТАРЗЯ розных фабрык у вялікім асартыменце.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Уп. Галоўлітбела № К—571. Друкарня газеты «Звязда». Менск, Совецкая, 63. К. Б. С